№№35–36
(2763–2764)

7 сакавіка 2008 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Народная Воля

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Шаноўныя чытачы!
Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 328-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 328-68-71.

ДУЭЛЬ

Лябедзька прыняў выклік

Адзіны спіс кандыдатаў ад дэмакратычных сіл на наступных парламенцкіх выбарах амаль зацверджаны, але, падобна, кропкі ў ім ставіць яшчэ рана. Адзін з бліжэйшых паплечнікаў Аляксандра Мілінкевіча, ягоны дарадца па міжнародных справах Аляксандр Лагвінец днямі выступіў з нечаканай ініцыятывай. Ён прапанаваў старшыні Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатолю Лябедзьку правесці ў Сухараўскай выбарчай акрузе Мінска праймерыз і высветліць, хто з двух прэтэндэнтаў мае большую падтрымку сярод выбаршчыкаў.

Цікавыя ў гэтай сітуацыі дзве акалічнасці: па-першае — **Анатоль Лябедзьк**а ўжо афіцыйна зацверджаны кандыдатам у дэпутаты па данай акрузе, а падругое — ствараемы Мілінкевічам рух *"За Свабоду"* раней заяўляў, што не будзе вылучаць кандыдатаў на парламенцкіх выбарах.

Сам спадар **Лагвінец** кажа, што нічога дзіўнага не адбылося. Паводле ягоных слоў, для жыхароў Сухарава ён не менш знаёмая фігура, чым Анатоль Лябедзька. Тым больш што ў 2004 годзе палітык ужо балатаваўся па ёй у дэпутаты парламента, у 2006-м — узначальваў мясцовы выбарчы штаб **Аляксандра Мілінкевіча**, а летась браў удзел у выбарах сталічных дэпутатаў па Сухараўскай выбарчай акрузе.

Лідэр АГП Анатоль Лябедзька прыняў выклік. Ён заявіў, што гатовы ўзяць удзел у такіх праймерыз:

— Нягледзячы на тое, што гэта прапанова спазнілася на сем месяцаў (бо адзіны спіс пачаў складацца менавіта тады), нягледзячы на тое, што паўтара месяца таму Мінская гарадская каліцыя вызначыла па працэдуры, якая была прапанавана, спіс кандыдатаў па горадзе Мінску, я, у прынцыпе, не супраць.

Але замест правядзення сходу грамадскасці Анатоль Лябедзька прапануе правесці ў акрузе сацапытанне. І каго падтрымаюць выбаршчыкі, той і павінен балатавацца ў парламент. Гэта, паводле меркавання лідэра АГП, будзе больш дэмакратычна:

— Працэдура вызначэння мацнейшага па схеме "колькі ты прывядзеш людзей на сход" — гэта для тых, у каго няма каманды. У мяне ёсць каманда, і ў Лагвінца, наколькі я ведаю, таксама ёсць каманда. Таму для нас трэба вызначыць іншы, больш дэмакратычны варыянт. Я прапаную правесці ў акрузе сацапытанне, каб да гэтага працэсу далучылася як мага больш выбаршчыкаў. Хай менавіта яны, а не актывісты, не нейкая невялікая група людзей, вызначаць, хто з нас мацнейшы.

Пры гэтым Анатоль Лябедзька падкрэсліў, што ў прапанове Лагвінца хаваецца небяспека для дэмакратычных сіл. Таму што такім чынам можа быць створаны прэцэдэнт. І зараз, калі адзіны спіс амаль цалкам падрыхтаваны, некаторыя палітыкі, якія раней адмаўляліся ўдзельнічаць у выбарах, таксама могуць запатрабаваць правесці праймерыз у іншых акругах.

— Гэта небяспечна не таму, што хтосьці з нас хвалюецца, што пацерпіць паразу падчас "перадвыбараў", а таму, што часу для гэтага ўжо не засталося.

Кастусь ВАНСЯНСКІ.

Задумаемся:

на рубель экспартнай прадукцыі мы, беларусы, трацім энергіі ў паўтара раза больш за палякаў, утрая больш за немцаў.

Хвіліна рэкламы на Нацыянальнай бібліятэцы каштуе 70 тысяч рублёў

У бібліятэцы кажуць, што гэта самы вялікі рэкламны носьбіт у краіне. Яго плошча — 1485 квадратных метраў. Кошт адной хвіліны — 70 тысяч рублёў. Праўда, час трансляцыі рэкламы абмежаваны — з 21-й па 22-ю гадзіну.

КАМЕРТОН
от Сергея Ваганова

Сталин умер! Да здра...

Позавчера исполнилось 55 лет со дня смерти Сталина. Почти юбилей. Но всякий раз, когда наступает 5 марта, с особой правдивостью возникает чувство, что он умер не до конца.

В 1949 году я видел "живого" Сталина в спектакле Купаловского театра, кажется, "Человек с ружьем". Он выходил к зрителям, обнимая Ленина, в заключительном эпизоде. Зал вставал, захлебываясь в овациях, крики "Браво!", слезы...

В 1955 году я видел Сталина рядом с Лениным в мавзолее. Как живого...

Это была, наверное, самая длинная очередь в мире. Помню, как двое в штатском тащили из нее третьего, почти старика, и по ногам его бился на длинном ремешке фотоаппарат "Зоркий"...

Сегодня мне кажется, что если бы Сталина не выбросили из мавзолея, в этом было бы меньше сталинщины: пусть не сразу, но, в конце концов, все могли бы увидеть, сколь ничтожен, безобразен и даже жалок этот старик, наводивший ужас на огромную страну и полмира. Вместе с уничтоженным им учителем они изжили бы себя в новых поколениях, превратились бы, как один из них, в ряженых на московских площадях. Увы, вместо тела оставили образ, коварный идеологический миф.

В 1961 году я видел, как сносили памятник Сталину в Минске.

Мы, четыре студента-историка, вышли после занятий в промозглую осеннюю ночь. И через полторы сотни метров наткнулись на свинцово-серую солдатскую цепь... Сквозными подъездами и подворотнями мы обошли эту неприступную цепь и, крадучись, проникли в темный двор дома, выходящего фасадом на площадь. Цепляясь за обжигающе скользкие ступени пожарной лестницы, мы забрались на крышу и почти ползком добрались до оградки на самом краю. Мы просидели там в обнимку всю ночь, трясясь от холода и озноба. Странно, я не запомнил каких-то особых подробностей. Только тягачи, заполненные мешками с песком, тросы, автоген, прожектор... К рассвету остался высокий постамент, украшенный по красноватому с прожилками мрамору белорусским орнаментом. А к середине дня место, где стоял памятник, было ограждено дощатым забором. Всю неделю до 7 ноября доносились из-за него глухие взрывы и остервенелая дробь перфораторов. Знающие люди поясняли, что у памятника очень глубокий и прочный фундамент...

Сегодня мне кажется, что если бы народ, еще недавно так горько рыдавший над кончиной своего кумира, лег под тягачи, увозившие истукана, в этом тоже было бы меньше сталинщины, чем в покорности, с какой он воспринял его изничтожение. Случилось бы так, можно было бы поверить в рыдания от Великой Любви. На поверку же вышло -- от Великого Страха...

Мое поколение рождения 1940-х годов, наверное, последнее, способное безошибочно узнавать в подробностях и общей атмосфере сегодняшней жизни черты сталинщины. Преследование и даже уничтожение политических противников; попытки установить тотальный контроль если не над умами, то над поведением кругом зависимых от начальства граждан; торжество приказа над законом; поиск врагов внутри страны и круговая оборона вовне; мнительность, мстительность, немотивированная жестокость; социальная демагогия и лицемерие изо всех источников пропаганды...

Кто-то скажет, наверное, что я исказил картину. Тогда пусть докажет, что ничего этого в нашей сегодняшней жизни нет.

А ведь докажет, приемы известны. Вот наиболее увлекательный: и при советской власти было много хорошего...

Да, и в сталинские, в советские годы люди рожали детей, растили хлеб, сочиняли книги, варили сталь и даже побеждали фашизм...

Много было хорошего при советской власти. Власть была отвратительна. "Как руки брадобрея" — лучше Мандельштама не скажешь.

Вообще-то руки — едва ли не главная проблема у любителей наводить "жесточайший порядок". Они либо изобретают для себя специфический жест, либо не знают, куда руки девать. Вы помните, например, жесты Рузвельта, Помпиду или сегодня — Ангелы Меркель? А вот фюрер кроме нацистского "хайль" очень любил потирать руки, Ленин — мять кепку или подпирать с двух сторон жилетку (нечеловеческий указующий жест — изобретение советских монументалистов), Сталин — держать руку за бортом френча, либо трубку в руке, либо подкручивать ус. Впрочем, и эта жестикуляция тоже может оказаться выдумкой... Одно известно доподлинно: у него была сухая рука.

Не отсохла...

Занавес не закрылся. Спектакль продолжается. Остается только поестественней приспосабливать "твердую руку".

Можно даже избежать подозрений в живучести сталинизма, если приспособить руку так, чтобы она не слишком бросалась в глаза. А вся черная сталинская работа творилась в подкорке электората.

Достаточно хотя бы вполголоса намекнуть: "Сталин умер! Да здра..."

kamerton_41@mail.ru

Паліна Смолава пазмагаецца за права спяваць на «Еўрабачанні-2008» за Расію

Адборачны канцэрт пройдзе 9 сакавіка ў прамым эфіры канала "Россия".

Смолава, якая нядаўна пераехала ў Маскву, дзе яе падтрымлівае былы спонсар Дзімы Білана алігарх Віктар Батурын, выступіць з песняй "На адлегласці дыхання", паведамляе сайт спявачкі.

У 2006 годзе Паліна Смолава ездзіла на "Еўрабачанне" ад Беларусі і заняла перадапошняе месца.

За прастытуцыю ў Беларусі будуць караць больш строга

Прэс-служба Міністэрства юстыцыі паведаміла пра падрыхтоўку закона "Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях супрацьдзеяння нелегальнай міграцыі, распаўсюджвання рабскай працы, прастытуцыі і дзіцячай парнаграфіі".

Законапраектам будзе ўстаноўлена крымінальная адказнасць за выкарыстанне рабскай працы, за вытворчасць, распаўсюджванне і іншыя дзеянні ў адносінах да матэрыялаў парнаграфічнага характару з удзелам непаўнагадовых, а таксама будзе ўзмоцнена адміністрацыйная адказнасць за занятак прастытуцыяй.



Креветочное дело

На белорусско-польском предприятии в Березе — затяжной конфликт из-за низкой зарплаты и жестких санкций Брестской таможни.

По официальным данным, средняя зарплата за 2007 год здесь составила всего 288 тысяч рублей, в том числе за декабрь — 300 тысяч рублей. Сами понимаете, что этот показатель как средняя температура по больнице: у одного может зашкаливать, а другой уже остыл.

Будем бастовать!

Многих тружениц не устраивают нормы выработки и тарифы. Поэтому они обратились за помощью к брестским правозащитникам и в Брестское региональное отделение Белорусского профсоюза радиоэлектронной промышленности, чья позиция по защите прав наемных работников отличается принципиальностью и справедливостью. Дело в том, что по уставу РЭП его членами *"могут быть работники и учащиеся всех без исключения отраслей народного хозяйства"*. Приехали в Березу экс-кандидаты в депутаты областного Совета Сергей Вакуленко, Владимир Малей, Владимир Величкин и руководитель регионального отделения РЭП Зинаида Михнюк. Выяснилось, что недовольные собрались объявить забастовку.

Прибывшие разъяснили, что хоть по Конституции трудящиеся и имеют право на это, но по закону о массовых мероприятиях нельзя бастовать без санкции властей. А кто даст те санкции, когда даже пикеты не разрешают? Достигли консенсуса в том, чтобы креветочницы объединились для защиты своих интересов, создав профсоюзную группу РЭП. Работницы заполнили бланки заявлений о вступлении в профсоюз. 14 февраля первичка была зарегистрирована.

Позиция работниц

По трудовым договорам, заключенным с администрацией предприятия, каждая работница обязана выполнить норму — выработать 65 кг мяса креветок в месяц! Тогда им выплачивается премия в размере 30% от заработка. За каждый килограмм чистого креветочного мяса (тяжкий труд) им платят лишь 2,2 тысячи рублей. Как поведала одна работница, если уложиться в месячную норму, то она получит аж... 143 тысячи рублей! Но для этого ей нужно работать без обеда. С учетом премии получается 187 тысяч рублей.

Зарплата у многих в среднем за год — ниже минимальной, утвержденной правительством. С октября 2007 года по февраль 2008 года "минималка" составляла 188.360, а с февраля стала 208.800 рублей. А заработок соответствует разве что бюджету прожиточного минимума ("черте бедности"), который до февраля с.г. составлял 185.670 рублей, а теперь 200.080 "рэ".

И это при том, что работники СП перерабатывают самую мелкую, а значит и самую трудоемкую креветку сорта "крангон-крангон", которую вылавливают в Северном море. Она имеет большую цену из-за высоких вкусовых качеств и хорошего спроса на западном рынке. Поэтому мясо креветок соучредитель СП — польская фирма "Ковян-Груп" — вывозит на Запад по заказу немецкой фирмы "Штюрк-Деликатесен" в режиме реэкспорта и там продает.

Позиция руководства

У руководителя "Трансоэкспресса" свое видение сложившейся ситуации.

"В Березе, в бывшем военном городке, мы купили в собственность здание столовой, — повествует руководитель предприятия Анатолий Швед. — *После его реконструкции наладили в нем производство, отвечающее стандартам не только Беларуси".*

"Да, лучший вид агитации — это зарплата, — согласен директор. — *Но вопрос о ней — очень больной. Наши планы были настроены на расширение производства в Березе. Мы убедили западного партнера в инвестировании дополнительных средств. Планировали набрать еще работников".*

Но случились, по мнению руководства, самые что ни на есть форс-мажорные обстоятельства. Как объяснил Анатолий Александрович, это ситуация с отходами производства — панцирями креветок, использование которых находится под контролем Брестской таможни.

До этого панцири, на которые при ввозе заявлялась символическая стоимость — 2,5 евро за одну тонну! — после переработки на протяжении последних 10 лет поступали бесплатно на комбикормовые заводы, птицефабрики и свинофермы как источник кальция.

Но в начале сентября 2007 года нежданно-негаданно для производителей вступил в силу указ главы государства №399 "Об определении таможенной стоимости товаров, неизбежно образующихся при получении продуктов переработки". В указе говорилось, что таможенная стоимость отходов приравнивается к стоимости сырья. Посему готовая продукция (мясо креветок) оказалась более чем в два раза дешевле панциря. За основу взяли то, что доля панциря в общем весе креветок составляет 70 процентов. Отходы ничего не будут стоить только в том случае, если есть заключение уполномоченного органа, что отходы не имеют коммерческой ценности.

Представители СП "Трансоэкспресс" ООО пошли на таможенный пост растаможивать очередную партию отходов. Государственная организация "Белтаможсервис", учредителем которой является ГТК Республики Беларусь, как и раньше, произвела расчеты таможенной стоимости отходов — по своей нормативной базе. Работа, кстати, оплачиваемая предприятием. Однако она сначала рассчитала предприятию минимальную стоимость отходов (всего 38,4 тысячи рублей за 62,8 тонны), и в свою очередь Брестская таможня приняла ее к оплате, а через несколько дней доначислила огромную сумму.

После уплаты предприятием ввозной пошлины Брестская таможня 27 сентября приняла решение — во исполнение нового президентского указа предприятие "Трансоэкспресс" ООО, не успевшее получить заключение органа, должна доплатить за отходы 101,6 млн рублей, то есть в 2900 раз больше, чем заплатили!

"Нам не дали ознакомиться с указом и подготовиться к его применению", — поясняет А.Швед. — Предприятие обязано было загодя представить в Брестскую таможню заключение Управления делами президента, что отходы креветок не представляли коммерческой ценности. Однако для этого просто не было времени. В конце концов заключение было получено и представлено в таможню, однако доначисленные таможенные пошлины не отменили".

Соучредитель СП — польская фирма "Ковен-Груп" — сообщил в Березу, что если вопрос не решится положительно, то руководство польской фирмы не видит другого выхода, кроме как ликвидировать "Трансоэкспресс". По крайней мере, об этом свидетельствует коллективное письмо, подписанное 166 работниками и направленное в Администрацию президента.

Круг сужался. 1 февраля заместитель начальника Брестской таможни Л.Большакова, установив факт неисполнения налогового обязательства в установленные сроки, вынесла решение — приостановить операции по счетам "Трансоэкспресса".

"Пока мы не решим этот вопрос, будем сражаться до конца, — сказал директор. — Или мы живем, или нас нет". Предприятие предъявило Брестской таможне иск о признании ее решения недействительным. Однако Хозяйственный суд области не нашел оснований его удовлетворить.

Думается, вопрос повышения зарплаты не стоит увязывать с доначисленной суммой платежей, предъявленных таможней. Для польской фирмы с таким оборотом и капиталом, который позволяет закупать креветки в больших количествах, везти их в фурах за тридевять земель в Беларусь, перерабатывать и реализовывать на Западе с приличным "наваром", какой-то 101 млн рублей — это не деньги. Просто компаньон, от которого все зависит, блефует, мягко говоря, лукавит. Заставил поверить в будущее закрытие руководство Березовского района. Кто будет резать курицу, несущую "золотые яйца"?

А вообще, кому нужны такие инвестиции зарубежного бизнеса? Ведь новые рабочие места создавались не для того, чтобы держать работников в "черном теле". Получается, что Беларусь для западного капитала — источник дешевой рабочей силы. Как то Марокко, куда польский партнер также поставляет креветки для переработки. Ясно, как божий день, что в Европе за такие гроши, которые платят нашим гастарбайтерам в Березе, никто даже пальцем не пошевелит.

Александр КОВАЛЬЧУК.

Брест.

Тело Ленина предадут земле

Вождя мирового пролетариата планируют предать земле — с почетом, как подобает провожать в последний путь лидера государства. Это может произойти в федеральном мемориальном комплексе, на котором обретут покой многие великие люди России. Он будет открыт в 2010 году, в день празднования 65-летия победы в Великой Отечественной войне.

На главной аллее мемориала будет всего тридцать могил. "Среди них найдется место и Ленину, — сообщил руководитель проекта народный художник России Сергей Горяев, — вопрос уже давно назрел. На заседании оргкомитета, посвященном строительству мемориального комплекса, обсуждалась возможность перезахоронения Владимира Ильича Ленина и других знаменитых людей, погребенных на Красной площади. Однако официальное решение еще не принято".

Владимир Путин еще в 2001 году подписал указ "О Федеральном военном мемориальном кладбище", однако с местом под мемориальный комплекс окончательно определились только недавно, выбрав участок в Мытищинском районе, неподалеку от деревни Сгонники. Поле размером в 53 гектара распланировали на 34 тысячи захоронений.

"Это будет государственное кладбище России, примерно такого же национального значения, как Арлингтонское для США, — пояснил Сергей Горяев. — Сегодня в мастерских уже заканчивают отделку скульптур плакальщиц, которые будут установлены там".

Народная Воля http://www.nv-online.info
7 САКАВІКА 2008 г.

РОЗДУМ

Сумны прысуд «тройкі»

Ні знакамітага мастака Гаўрылу Вашчанку, ні вядомага архітэктара Уладзіміра Папругу прадстаўляць чытачам "Народнай волі", думаецца, не трэба. Як і пісьменніка Васіля Якавенку.

Па ініцыятыве апошняга "тройка" сустрэлася неяк у цэнтры Мінска і зрабіла незабыўную экскурсію. З роздумам пра сённяшні і ўчарашні дзень сталіцы, пра яе гістарычную спадчыну, пра традыцыі і тэндэнцыі дойлідства, пра ўплыў архітэктурнага асяроддзя на чалавека і пра многае-многае іншае.

Вось якія нататкі прапанаваў Васіль Якавенка пасля той памятнай экскурсіі.

На здымку (злева направа): У.Папруга, В.Якавенка, Г.Вашчанка.

Гаўрыла Вашчанка, *народны мастак Беларусі, мой зямляк, аброслы сівой барадой, кашчавы, магутны, што сам Бог Саваоф:*

— Я пражыў эпоху, якая параджала дзівосныя парадоксы. Лічылася, напрыклад, дзікунствам тое, што ў свой час войскі Напалеона ў Маскве размяшчалі канюшні ў велічных саборах, адначасова ўспрымалася як нармальная з'ява, калі ў савецкі перыяд ў тых жа храмах былі турмы, склады, майстэрні...

Пры панаванні бальшавіцкага рэжыму заўжды адмоўна ставіліся да прапаноў па захаванні архітэктурнай спадчыны, гістарычных і культавых будынкаў. Ніяк нельга было пераламаць настрой: *"Мы старый мир разрушим до основанья, а затем..."* А навошта было бурыць? Стары свет з ягонай матэрыяльнай культурай нікому не перашкаджаў, больш таго — ён заўжды фарміруе і сучаснасць, і будучыню...

Уладзімір Папруга, *былы Галоўны дзяржаўны інспектар Мінгарвыканкама па ахове гісторыка-культурнай спадчыны, архітэктар, па ўзросце, бадай, — сын свайму субяседніку. Ён тлумачыць нам і не столькі нам, колькі маладым людзям, якія аказаліся побач на галоўнай плошчы Мінска:*

— Грэблівасць, агрэсіўнае ігнараванне ўласнай гісторыі і спадчыны — з'ява па паходжанні не беларуская. Гэта вынік спланаванай, свядомай і старанной работы, разгорнутай у Беларусі не намі і не сёння.

1795 год. Адсюль і пачалася "невядомая" вайна. Расійская імперыя ўсімі сродкамі імкнулася як найхутчэй пацвердзіць тэзіс аб *"истинной русскости"* беларускіх земляў, каб хоць як-небудзь апраўдаць іх інкарпарацыю. Фармальна з таго самага часу пачалі знішчацца ўсе нацыянальныя адметнасці беларусаў. І тое, што дзеелася, да болі нагадвае фармат стварэння *"саюзнай дзяржавы"* ў бачанні сённяшніх маскоўскіх стратэгаў.

Адрозненняў у беларусаў ад рускіх і тады было куды больш, чым падабенства. Нават мястэчкі ў нас мелі еўрапейскую планіровачную структуру і адпаведную архітэктуру. Мелі Магдэбургскае права і ратушы як сімвалы самакіравання. У Беларусі не было ніводнага праваслаўнага храма ў *"истинно русском"* стылі. Галоўнай праваслаўнай святыняй у Мінску дагэтуль з'яўляецца каталіцкі жаночы бернардзінскі кляштар, збудаваны ў стылі віленскага барока.

Сродкі, якія ўжываліся метраполіяй для ажыццяўлення асіміляцыйных працэсаў на беларускіх землях, — разбурэнне нацыянальных каштоўнасцяў і будаўніцтва аб'ектаў у расійскім духу, якія павінны былі б увасабляць веліч імперыі. Таму тое, што адбываецца сёння з гістарычнымі цэнтрамі нашых гарадоў, ёсць працяг вельмі даўняй і непрыгожай гісторыі, і яна не толькі яшчэ не завершана, але, як выглядае гэта на прыкладзе Мінска, нават спрабуе ўвайсці ў *"кульмінацыйную"* фазу.

Выкананне ідэалагічнай праграмы, якая больш за дзвесце год таму навязана адміністрацыяй суседняй дзяржавы, — працэс цалкам зразумелы і лагічны з пункту гледжання менавіта гэтай дзяржавы. Але ён выглядае абсурдам у фармаце незалежнай Рэспублікі Беларусь.

Генеральным планам Мінска 1965 года і архітэктурным конкурсам, праведзеным у 1969 годзе, гістарычны цэнтр сталіцы быў прыгавораны да знішчэння.

Гаўрыла Вашчанка: — Перад намі Палац Рэспублікі... Будынак мажны, але ў ансамбль, раней створаны тут, не ўпісваецца. Калісьці на гэтым месцы, толькі крыху глыбей, планавалася паставіць музей У.І.Леніна. Зыходзячы з тых жа планаў, увесь Верхні горад ішоў пад знос. Меркавалася пакінуць толькі комплексы былых жаночага і мужчынскага бернардзінскіх кляштараў. Планавалі на схіле гары размясціць каскад фантанаў, як у Пецяргофе. Былі сямідзесятыя гады... Вядома, не ўсім такі праект падабаўся. У той час Саюзам мастакоў БССР кіраваў Стэльмашонак. А я быў сакратаром і ўваходзіў у склад Мемарыяльнай мастакоўскай камісіі ў Маскве.

Нам вельмі карцела выступіць з альтэрнатыўнай ініцыятывай. Адно патрабавалася — грунтоўная падрыхтоўка. Патрэбны былі незалежныя спецыялісты. Дзе іх узяць?.. І запрасілі мы з Масквы майстроў сваёй справы. Разам з нашымі спецыялістамі ўтварылі групу для распрацоўкі альтэрнатыўнага праекта. Распрацавалі. Выставілі на агляд у Палацы мастацтваў. Запрасілі першага сакратара ЦК КПБ Пятра Машэрава, іншых высокіх асоб — кіраўнікоў устаноў культуры і горадабудаўніцтва. І што далей? Супраць альтэрнатыўнага праекта ніхто не пярэчыў. Толькі ж сумненні ў Машэрава яшчэ заставаліся. І пайшлі мы з ім разам сюды, на плошчу. Ходзім, глядзім... "Пётр Міронавіч, — кажу, — уявіце на тым схіле фантаны... З аднаго боку паглядзіце на іх, з другога... Пагадзіцеся, што яны ніадкуль не будуць бачныя нават з вышыні вашага двухметровага росту!" Машэраў мусіў пагадзіцца. Адцураўся тады ён ранейшага плана, хоць быў той план ужо і зацверджаны ў ЦК КПБ.

Раскажу яшчэ эпізод. Аднойчы архітэктары прапанавалі мне распрацаваць вітражы для Дома кіно ў Чырвоным касцёле. Увогуле будынак касцёла планавалася знесці яшчэ з канца 1950-х і на тым месцы пабудаваць панарамны кінатэатр. Дзякуй богу, не паспяшаліся з выкананнем таго рашэння, а маглі б і тут наламаць дроў. Касцёл ужо быў перагароджаны на два паверхі. Другі паверх хацелі разбіць на мноства кабінетаў і кабінецікаў. Я параіў не рабіць гэтага, а адвесці заліты з усіх бакоў святлом паверх пад актавую залу. О, якая прыгажосць там потым была! Паставілі вітражы, і мы наладзілі там выставу праекта забудовы горада. Прыйшлі Машэраў, Кісялёў, Кузьмін, іншае высокае начальства. Быў пахмурны і ветраны дзень. Сонца выблісне — вітражы як зайграюць! Боская прыгажосць! Захоплены гэтым відовішчам Машэраў і гаворыць сваім паплечнікам з ноткай пакаяння: "Ну, бачыце, што ў каменнай прасторы творыцца, а мы хацелі разбурыць і знесці такую каштоўнасць!" Кузьмін, сакратар ЦК па ідэалогіі, той потым мне з вока на вока: "А вы, шаноўны, ведаеце, што ў мяне на стале сотні пісем ляжыць ад вернікаў — вярнуць ім касцёл!!! Ці не дарэмна ў такім разе вы вітражы распрацоўвалі?" — "Не, — адказваю, — і касцёлу вітражы спатрэбяцца".

Тут я палічыў за патрэбу расказаць невыпадковым сваім субяседнікам пра маё ўласнае ўражанне ад сцен Дома кіно, бо ў 1976—1977 гадах працаваў там адказным сакратаром Саюза кінематаграфістаў БССР. Саюзам тады кіраваў Віктар Тураў. Праўда, мне рупіла паведаць ім не столькі пра сваё захапленне, колькі яшчэ пра адну прыгоду, што нітавалася з імем Машэрава.

Мы прымалі ў Доме кіно вялікую дэлегацыю Саюза кінематаграфістаў СССР на чале з С.Герасімавым. Майстры кіно праводзілі ў нас свой выязны пленум. Што абмяркоўвалася на ім — цяпер не адразу і прыгадаеш. Але на другі дзень стала вядома: даў згоду прыняць маскоўскіх гасцей Машэраў. І вось гэта неўзабаве засланіла ўсе іншыя ўражанні і пачуцці масквічоў. Яны ішлі на прыём, разлічваючы на 15-хвілінную дзяжурную сустрэчу і гаману, прадугледжаную этыкетам гасціннасці. А прасядзелі ў кабінеце першага сакратара ЦК КПБ з раскрытымі ратамі ажно дзве з паловай гадзіны, і размова ішла толькі пра кіно. І ніхто з іх — ніводзін прафесійны кінематаграфіст з таго тузіна, апроч хіба Сяргея Герасімава, не ў стане быў падтрымліваць размову з Машэравым на тым узроўні, на якім гаспадар кабінета яе павёў. Яны былі ашарашаныя той сустрэчай. Пасля сустрэчы я бачыў захапленне на іх тварах, слухаў, што казалі яны. "Чаму ён у вас не выступае штотыдзень перад народам па тэлебачанні? — пыталіся, усхваляваныя. — Гэта ж трыбун!" І адказаць ім не было чаго. Не сакрэт, што на кожны свой крок Машэраў павінен быў браць дазвол там, дзе не было ні таго ягонага таленту, ні таго ягонага розуму і, само сабой, не было і не павінна было быць ніякага трыбуна.

Калі я скончыў, да тэмы гаворкі вярнуўся **Уладзімір Папруга:**

— Галоўнай драмай для гістарычнай забудовы і гістарычнай планіровачнай структуры, для ўсяго масіву, які ацалеў у вайну, стала яго планамернае вынішчэнне пасля вайны. Афіцыйная версія сарамліва даводзіць, што падчас Другой сусветнай вайны гістарычны цэнтр быў цалкам знішчаны. Спецыялісты ведаюць, што гэта няпраўда. У Мінску за ўсю вайну не адбылося ніводнага вулічнага бою. Разбурэнні тут былі не большыя за разбурэнні іншых еўрапейскіх гарадоў і непараўнальныя, напрыклад, з блізкай Варшавай. Ніводзін акупант у свеце не здольны знішчыць асноўнае ў любым гістарычным горадзе — ягоную планіровачную структуру. Гэтым пасля вайны мэтанакіравана занялася савецкая адміністрацыя — у поўнай адпаведнасці з яшчэ даваеннымі планамі "рэканструкцыі" 1936—1938 гадоў.

Я не ведаю ў сусветнай гісторыі прыкладаў вынішчэння не толькі ўласнай спадчыны, але і чужой у падобных маштабах. Мы, бадай, адзіная нацыя ў Еўропе, якая дагэтуль не ведае, што ў яе ляжыць пад нагамі.

Гаўрыла Вашчанка: — Бяда ў тым, што дагэтуль стары горад не рэстаўрыруецца, а рэканструіруецца. Праўда, штосьці яшчэ захавалася. Але было б куды болей, дык былы галоўны архітэктар горада Сяргей Мусінскі, знаходзячыся пад уплывам бальшавіцкай гігантаманіі, літаральна ўзламаў забудову Нямігі сваім мастадонтам на цэлы квартал: наце вам Гандлёвы дом на Нямізе! Гэтым Домам была перакрытая вуліца Астроўскага (цяпер Ракаўская)... Па другі бок — знесена Няміга. А за Свіслаччу — стылізацыя, дзе ні на грам аўтэнтычнага. У Траецкім прадмесці будынкі прылізаныя, асучасненыя — фанерны горад! У цэлым скрозь усё парэзана, пакручана, знішчана без патрэбы.

Уладзімір Папруга: — Цяпер у Беларусі сцерлі разуменне таго, што ёсць насамрэч рэстаўрацыйны працэс. Апаратам Мінкультуры свядома знішчана сама сістэма ацэначных крытэрыяў. Так званыя эксперты, якія абгрунтоўваюць горадабудаўнічую палітыку адміністрацыі горада, ідуць не ад свайго назапашанага вопыту, а ад суб'ектыўных успамінаў, што колісь бачылі з вокнаў аўтобуса дзе-небудзь у Страсбурзе ці падчас выпадковага некалькігадзіннага наведвання Венецыі. Што насамрэч бачылі шаноўныя дыскутанты, застаецца і дагэтуль для іх загадкай, але суб'ектыўныя аргументы, ад якіх Беларусь штораз страчвае кожны наступны фрагмент сябе самой, гучаць і надалей. І сёння ўжо нікога не турбуе, што аўтэнтычна дахі жылой забудовы XIX стагоддзя ў Мінску ніколі не мелі дахоўкі, а спрэс былі крытыя бляхай. Тым не менш Траецкае прадмесце і дагэтуль лічыцца за "ўзор" рэстаўрацыі.

Гаўрыла Вашчанка: — Неяк падчас нашых адраджэнцкіх клопатаў была ў мастакоў і архітэктараў ідэя стварыць у Мінску гісторыка-архітэктурны запаведнік па прынцыпе Полацкага. Толькі не ў абстрактным сэнсе запаведнай тэрыторыі, унесенай у дзяржаўны спіс, а ў статусе навукова-даследчай установы з адпаведным штатам даследчыкаў, гісторыкаў, з адпаведнымі правамі і паўнамоцтвамі. Пад адным з ім дахам, між іншым, мог бы знайсці месца і музей гісторыі Мінска, пра які пятнаццаць гадоў ужо безвынікова вядзецца гаворка. Я ведаю, Уладзімір Адамавіч, што вы гэту ідэю горача падтрымлівалі і падтрымліваеце. Мяркую, што, стварыўшы падобную даследчую ўстанову, якая б сумяшчала функцыі гаспадара і заказчыка, мы маглі б годна выйсці з сучаснага крызісу ў гістарычных кутках Мінска.

Мы, беларусы, бадай адзіная нацыя ў Еўропе, якая дагэтуль не ведае, што ў яе ляжыць пад нагамі

Неўзабаве, пакінуўшы Кастрычніцкую плошчу, мы выйшлі на плошчу Свабоды, спыніліся каля ратушы, аднаўленай у апошнія гады. Цяпер я люблю гэты высокі і адметны куток горада. Настрой, праўда, псуюць шматпалосная транспартная магістраль ды шыльды на піўным рэстаране, што месціцца ў былых гандлёвых радах. Яны выкананы ў тым жа кандовым, старарэжымным расійскім духу: ***"Ресторанъ пивной"****. І побач:* ***"У Адмирала"****,* ***"Ресторан "Винарня"****. Слова* ***"вінарня"****, дарэчы, больш адпавядае не расійскаму стылю, а беларускаму ладу гучання... Недарэчнае атачэнне для ратушы! Але ўжо сам факт аднаўлення ратушы, нават у такім не дужа аўтэнтычным выкананні — свята душы.*

Вось бы выканаць да канца тое самае рашэнне Мінгарвыканкама, у адпаведнасці з якім была адноўлена ратуша, ды аднавіць і рэнесансную царкву Святога духу, якая выходзіла сюды сваім велічным фасадам!

Цяпер, калі я чую тут размераны бой "курантаў", меладычны і чысты, як сама вечнасць, мне кожны раз прыгадваецца іншы ўрачысты момант.

Былі то ці не шасцідзесятыя гады, напрыканцы, ці, можа, пачатак сямідзесятых — у вялікім квадратным гадзінніку на сталічным Галоўпаштамце ўсталявалі механізм, які надаваў яму, гадзінніку, ролю дзяржаўных курантаў. І вось праз пэўны тэрмін на слых клаўся не толькі бой, але і мелодыя песні-гімна "Радзіма мая дарагая...". Не думаю, каб тое чынілася ў сталіцы без увагі Машэрава, Кузьміна, не гаворачы ўжо пра гарадскія ўлады.

На жаль, той гадзіннік на Галоўпаштамце спяваў гімн аб нацыянальнай адметнасці беларусаў усяго толькі месяц ці трохі болей — да часу, пакуль яго голас не дайшоў да Масквы.

...Перад намі, калі мы трохі адышлі ад ратушы ў бок Свята-Духавага кафедральнага Сабора (былога жаночага бернардзінскага кляштара), адкрылася панарама Ніжняга горада ў нагрувашчванні камяніц уздоўж Свіслачы і па праспекце Пераможцаў (былой Паркавай магістралі). Леваруч у паветры перасякаў вуліцу Нямігу "путепровод" — мост з вуліцы Леніна на цяперашні праспект Пераможцаў. Уладзімір Папруга звярнуў нашу ўвагу на транспартны затор на вуліцы Леніна, як на нешта недарэчнае. А ніжэй, на Нямізе, сітуацыя з транспартным рухам была ніколькі не лепшая. Да таго ж я ведаў, што там, каля Гандлёвага дома, дзе заўсёды густа тоўпіцца люд, дыму, смогу таго — не прадыхнуць.

Папруга бачыў іншае рашэнне транспартнай развязкі, і не толькі ў гэтым месцы. У гаворку ўступілі маладыя людзі, якія, як мы заўважылі, даўно прыклеіліся да нас. Ды і як яны, студэнты архітэктурнага факультэта, маглі не "зачапіцца" за такіх абарыгенаў, як Вашчанка і Папруга:

— Мы чулі, што з'явіўся альтэрнатыўны праект рэканструкцыі, рэстаўрацыі і аднаўлення гістарычнага цэнтра Мінска. Вы, спадар Папруга, і ёсць аўтар? Гэта праўда, што вы, пакінуўшы пасаду ў Мінгарвыканкаме, колькі год працавалі адзін над гэтым праектам? Бясплатна...

Уладзімір Папруга: — Сапраўды, пяць гадоў я аддаў гэтаму праекту. Вялікім было расчараванне ад таго, што ў архітэктурнай практыцы рабілася і робіцца дагэтуль. Хацелася нейкім чынам паспрыяць больш людскаму абыходжанню з гісторыка-культурнай спадчынай Мінска ды ўвесці яе ў прававое поле (створанае дзеючым і, на вялікі жаль, не дзеючым заканадаўствам). Не мной адным, а групай спецыялістаў і прадстаўнікоў інтэлігенцыі быў накіраваны на пачатку лютага 2005 года кіраўніку дзяржавы, у Пракуратуру Рэспублікі Беларусь і Камітэт дзяржкантролю зварот з просьбай аказаць дапамогу. Яна патрэбна ў вырашэнні праблемы спадчыны, і не толькі спадчыны, але і далейшага лёсу сталіцы ў цэлым.

Фактаў шматлікіх парушэнняў нарматыўна-прававой базы, пералічаных у звароце, ніхто не аспрэчваў, але і за рашэнне праблемы ніхто таксама не ўзяўся — нібыта з-за адсутнасці горадабудаўнічай альтэрнатывы.

Толькі ж акцэнты ў звароце ставіліся менавіта на прававых пытаннях, на іх вырашэнні, паколькі альтэрнатыўнага бачання не было прадстаўлена, а наш праект не быў завершаны. У любым выпадку галоўнае ўсё ж — дакладнае выкананне заканадаўства. Бо толькі гэта можа гарантаваць ад мажлівых памылак у абыходжанні з гісторыка-культурнай каштоўнасцю і забяспечыць далейшую перадачу гэтага скарбу наступным пакаленням ва ўсім багацці яго аўтэнтычнасці.

Крыжападобная транспартная развязка Няміга — Паркавая магістраль, якую вы бачыце, была заклікана разгрузіць горад. На самай справе яна "пахавала" пад сабою найбольш каштоўную ў гістарычным плане тэрыторыю і неверагодна ўскладніла транспартны рух сталіцы. Як вынік: двухмільённы горад сёння практычна зведзены да адзінага "галоўнага" скрыжавання ў раёне ГУМа. Шасціпалосная Паркавая магістраль нечакана ўпіраецца ў сціплы дачны пасёлак у раёне Ждановічаў, а Няміга—Багдановіча заканчваецца тупіком на вуліцы Кальцова. З пункту гледжання горадабудаўнічай логікі, два "канцы" новаствораных восяў з'яўляюцца "шляхам у нікуды". Штучнасць і нежыццяздольнасць гэтай схемы відавочная.

У Мінску радыяльная гістарычная планіровачная схема пасля вайны свядома знішчана, а альтэрнатыўную дагэтуль не стварылі. Транспарт, які карыстаецца згаданай тут развязкай, на 97 працэнтаў сёння з'яўляецца звычайным транзітам. У гэты самы цэнтр няма нават з'ездаў ад Гарадскога Валу аж да вуліцы Купалы. Мы свядома, насуперак Закону "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны", не толькі сабралі ўвесь мажлівы транзіт менавіта там, адкуль усе буйныя гарады яго выводзяць, але і актыўна замацоўваем гэтыя "дасягненні" новым нагрувашчваннем чужародных будынкаў.

Гаўрыла Вашчанка: — Я мяркую, Уладзімір Адамавіч, што па абгрунтаванасці і глыбіні распрацоўкі, па арыгінальнасці, урэшце, ваш альтэрнатыўны праект не мае нічога, з чым яго можна было б супаставіць. Да яго будзе ўвага, не сёння, дык заўтра — ніхто не асмеліцца праігнараваць гэта мастацкае і перш-наперш горадабудаўнічае рашэнне. Як ні круці, а гэта ўжо гістарычны факт, і прыклад для вырашэння праблемы, і прафесійная адказнасць...

Маладыя людзі: — Спадар Папруга, а што ж трэба зрабіць у першую чаргу згодна з вашым праектам?

Уладзімір Папруга: — Гістарычны цэнтр сталіцы, пра які тут гаворка, гэта ўсяго 0,3 працэнта яго сучаснай тэрыторыі. Дыяметр Старога Мінска — 400—700 метраў, у адрозненне, напрыклад, ад 3—4-кіламетровага дыяметру гістарычнага цэнтра Рыма, але там нікому і ў галаву не прыйдзе вырашаць горадабудаўнічыя праблемы "нашымі" метадамі. Вартасць гістарычнага Мінска проста неацэнная. У ім ягоная тысячагадовая душа. І — ці застанецца яна надалей?

Каб не замацоўваць новымі аб'ектамі горадабудаўнічыя пралікі 70-гадовай даўніны, а, наадварот, звесці да мінімуму іх уплыў у будучым, трэба тэрмінова перагледзець транспартную схему ў абслугоўванні планіровачнага ядра сталіцы. І зноў жа з гэтым ніхто не спрачаецца, што нават дакументальна зафіксавана.

Але пры незавершанасці і нескарэктаванасці транспартнай схемы на тэрыторыі гістарычнага цэнтра явачным парадкам закладваюцца новыя аб'екты, якія састарэлую транспартную схему замацуюць настолькі, што яе карэкціроўка стане мажлівай толькі пры ўмове вынасу адсюль гэтых самых аб'ектаў, якія будуюцца і праектуюцца сёння.

Толькі прамыя затраты на выпраўленне горадабудаўнічых памылак, якія сёння інерцыйна дапускаюцца, будуць роўныя кошту сённяшніх інвестыцый. Фінансавая рызыка інвестараў між тым бязмежная. І неяк ужо зусім шэра і бязрадасна на гэтым фоне бачацца службовыя асобы, якія ідуць на прыняцце супрацьпраўных рашэнняў і іх узгадняюць.

...Шкада, што газетная плошча не дазваляе выкласці ўсё тое, пра што гаварылі "тройка" спрактыкаваных людзей і купка моладзі, якая прыляпілася да нас падчас той экскурсіі па цэнтры Мінска. Калі мы развіталіся, мне падумалася: эх, дарэмна не запрасілі галоўнага гораданачальніка спадара Міхаіла Паўлава. Абавязкова трэба зрабіць, каб ён хоць прачытаў гэтую публікацыю.

Васіль ЯКАВЕНКА,
пісьменнік.

P.S. *Дарэчы, з праектам рэканструкцыі, рэстаўрацыі і аднаўлення гістарычнага цэнтра Мінска, які распрацаваны архітэктарам У.Папругам, можна пазнаёміцца на сайце www.nation-sos.info*

ДЭМАКРАТЫЯ ПА-БЕЛАРУСКУ

Рэкорд па затрыманнях

Шэсць разоў за два дні міліцыя затрымлівала Аляксандра Мілінкевіча. Гэта здарылася падчас ягоных паездак па Брэсцкай вобласці.

Па дарозе ў Брэст аўтамабіль Мілінкевіча затрымлівалі аж 4 разы. Аднак ён усё ж дабраўся да Брэста і правёў сустрэчу з мясцовымі жыхарамі, на якую прыйшло каля 200 чалавек. На наступны дзень Мілінкевіч паехаў у Кобрын, але аўтамабіль быў спынены супрацоўнікамі ДАІ яшчэ да горада. Яны прапанавалі праехаць у аддзяленне міліцыі. Аднак Мілінкевіч на гэты раз не быў за рулём, ён адправіў кіроўцу з аўтамабілем у міліцыю, а сам з паплечнікамі пайшоў у Кобрын пешшу.

Сустрэча з жыхарамі горада праходзіла пад праліўным дажджом, на яе прыйшлі каля 30 чалавек. Пасля акцыі Мілінкевічу прапанавалі наведаць мясцовую міліцыю для дачы тлумачэнняў у справе арганізацыі "несанкцыянаванага мерапрыемства".

АДУСЮЛЬ

Каму КДБ дазволіць уезд і выезд?

Абнародаваны план падрыхтоўкі законапраектаў на гэты год, у якім значыцца Закон "Аб парадку выезду з Рэспублікі Беларусь і ўезду ў Рэспубліку Беларусь грамадзян Рэспублікі Беларусь", работай над якім займаецца КДБ.

Неабходнасць распрацоўкі законапраекта нібыта выклікана тым, што апошнім часам розныя заканадаўчыя акты, датычныя выезду і ўезду ў Беларусь, зазналі пэўныя змены. У прыватнасці, быў скасаваны дазвольны штамп на выезд, а таксама ўведзеныя абмежаванні на выезд для тых асоб, у дачыненні якіх вядзецца крымінальны пераслед або якія маюць фінансавыя запазычанасці паводле рашэнняў судоў і іншае. Гэтыя новаўвядзенні, аднак, уступаюць у супярэчнасці з іншымі актамі і выклікаюць мноства пытанняў.

У той жа час у прэс-службе КДБ пакуль адмаўляюцца ад якіх-небудзь каментарыяў наконт новага закона.

Гомельскія дэмакраты патрабуюць рэферэндуму

Гомельская абласная арганізацыя Аб'яднанай грамадзянскай партыі на сваёй канферэнцыі вырашыла ініцыяваць збор подпісаў пад патрабаваннем правесці агульнанацыянальны рэферэндум наконт мэтазгоднасці будаўніцтва ў Беларусі атамнай электрастанцыі. Гомельскія дэмакраты прынялі заяву, у якой заклікалі ўсіх грамадзян Беларусі, каму не абыякавы лёс краіны, здароўе і дабрабыт будучых пакаленняў, далучыцца да патрабавання правесці такі рэферэндум. Па такіх важных пытаннях улада ўсё-такі павінна раіцца з народам!

У Магілёве канфіскавалі дыскі з фільмам, які прысвечаны Аляксандру Казуліну

У апошнія некалькі тыдняў грамадская камісія "Свабоду Казуліну" правяла маштабную інфармацыйную кампанію па ўсёй краіне. Актывісты грамадскага руху распаўсюджвалі дакументальны фільм "На перадовой правды", які расказвае аб падзеях, што адбываліся вакол прэзідэнцкай кампаніі 2006 года. Фільм распавядае аб удзеле Аляксандра Казуліна ў барацьбе на пасаду прэзідэнта, аб супрацьзаконных дзеяннях з боку ўлады ў дачыненні да Казуліна, аб судовым працэсе над ім.

Акрамя таго, дэмакратычныя актывісты распаўсюджвалі брашуру "Пакаранне без злачынства", у якой зафіксаваны ўсе парушэнні ў крымінальнай справе Казуліна.

"Амаль паўсюль інфармацыйная кампанія прайшла спакойна, — распавёў "Народнай волі" сябра грамадскай камісіі "Свабоду Казуліну" Алег Волчак. — *За вельмі кароткі тэрмін было раздадзена па 5 тысяч экземпляраў фільма "На передовой правды" і брашуры "Пакаранне без злачынства". У гэтай кампаніі мы ставілі перад сабой задачу праінфармаваць аб тым, што ў Беларусі парушаецца закон, не столькі жыхароў сталіцы, колькі грамадзян, якія жывуць у абласных цэнтрах і маленькіх гарадках Беларусі.*

Адзіны інцыдэнт адбыўся ў Магілёве. Там былі канфіскаваны 10 дыскаў з фільмам. Зараз гэтыя дыскі знаходзяцца ў юрыдычным аддзеле Магілёўскага аблвыканкама, дзе павінны прайсці нейкую экспертызу".

Алег Волчак гаворыць, што канфіскацыя фільмаў у Магілёве адбылася з-за боязі ўлад. *"Канфіскавалі і сапраўды няшмат. Усё астатняе актывісты паспелі распаўсюдзіць,* — працягвае Алег. — *Канфіскацыя сведчыць аб тым, што ўлады панічна баяцца распаўсюджвання праўдзівай, альтэрнатыўнай інфармацыі аб тым, што сапраўды адбываецца ў Беларусі. Аднак працэс інфармавання насельніцтва не спыніць — людзі самі зацікаўлены ў гэтым. Нам штодзень паступаюць дзесяткі просьбаў аб тым, каб мы пераслалі ў той ці іншы населены пункт кнігі і фільм, прысвечаныя Аляксандру Казуліну, а гэта значыць, што інфармацыйная кампанія будзе працягвацца і далей".*

Віталь ГАРБУЗАЎ.

ВІНШУЕМ!

Маладосць — яна ў душы...

Вядомы беларускі паэт Мікола ЧАРНЯЎСКІ адзначыў адразу дзве знакавыя даты ў сваім жыцці — 65-годдзе і 50-годдзе творчай дзейнасці.

Зала ў Чырвоным касцёле была запоўнена "пад завязку". Юбіляра прыйшлі павіншаваць творчыя калектывы, яго шматлікія вучні, былыя калегі па працы, блізкія і знаёмыя. Мікалай Мікалаевіч прымаў віншаванні і шчыра ўсміхаўся...

— Творчы ўраджай Мікалая Чарняўскага вельмі багаты — 35 кніг для дзяцей і дарослых, якія даўно палюбіліся тым, хто змалку шануе роднае слова, — расказвала вядучая. — Яго кніжкі выдаваліся ў Расіі і Польшчы, ён лаўрэат літаратурных прэмій імя Янкі Маўра і Васіля Віткі, узнагароджаны дзяржаўнымі ўзнагародамі. Шчыры, выдатны, сціплы чалавек і надзейны сябра. Апошнія 18 гадоў Мікалай Мікалаевіч працаваў у "Вясёлцы", дзе, дарэчы, і атрымаў свой першы ганарар. Такі вялікі, што яго хапіла на смажаную трэску з булачкай, што было ласункам для вясковага хлапчука, а таксама касцюм да выпускнога вечара.

"Старасць — гэта не сівая галава, яна ў іншым, — павіншаваў Міколу Чарняўскага галоўны рэдактар "Вясёлкі" і старшыня праўлення Беларускага дзіцячага фонду Уладзімір Ліпскі. — *А маладосць — у душы. Таму колькі б гадоў па пашпарце ні стукнула, у душы, Мікола, ты — малады. Бо крыніца тваёй маладосці — дзеці, божыя пасланнікі на зямлі. І мне здаецца, што таго, хто дапамагае дзецям, ацэньвае сам Бог. І ў гэтым сэнсе Мікалай Чарняўскі шчаслівы чалавек".*

Віншуем і мы Вас, Мікалай Мікалаевіч!

Алесь СІВЫ.
Фота аўтара.

Народная Воля http://www.nv-online.info
7 САКАВІКА 2008 г.

Дэфіцыт знешняга гандлю і паслуг Беларусі склаў у 2007 годзе аж 2 мільярды 750 мільёнаў долараў, хаця Аляксандр Лукашэнка ставіў задачу дасягнуць станоўчага сальда ў памеры 500 мільёнаў долараў.

Следует ли нам воспринимать реформистскую риторику Дмитрия Медведева всерьез? Если он искренен, имеет ли он шанс воплотить ее в жизнь? Останется ли истинная власть у Путина, или он разделит ее с Медведевым? И если да, то будет ли этот дуэт, первый в истории России, стабилен?"

Было бы ошибкой думать: раз Путин все еще чрезвычайно популярен, Медведев будет просто изображать из себя английскую королеву, рассуждает LE TEMPS. Потому что Медведев — это не абы кто. Этот давний соратник Путина является еще и председателем правления газового гиганта "Газпром", одним из олигархов, которые сделали себе состояние, завладев основными богатствами России. И самое главное из этих сокровищ — как раз "Газпром". В своем знаменитом интервью Дмитрий Медведев пропел хвалу "свободе во всех ее проявлениях, личной свободе, экономической свободе и свободе самовыражения".

Старший специалист по России и Восточной Европе Национального фонда за демократию Джон Скуайр в интервью Русской службе "Голоса Америки" выразил сомнение в том, что новоизбранный президент России поведет страну курсом демократии.

О самих выборах он сказал так: Касьянов, бывший премьер-министр правительства Путина, не попал в список кандидатов. ЦИК сказал, что в его списке подписей было слишком много ошибок. Интересно то, что у господина Богданова сбор подписей прошел гладко. Он возглавляет очень небольшую, маргинальную демократическую партию. И мне кажется, что это сделано для того, чтобы, если в Кремле кто-то спросит: "Почему не было никаких либералов в списке?", они могли бы указать на господина Богданова и сказать: "Ну вот, он либерал". Во время кампании по ТВ говорили почти исключительно о Медведеве. И почти не говорили о трех других кандидатах. Еще говорили очень много о Путине. И все государственные телеканалы так действовали.

Хиллари Клинтон, которая претендует на то, чтобы стать кандидатом в президенты США от демократической партии, заявила: "Президентские выборы в России, где произошло водворение Дмитрия Медведева в качестве лично указанного Владимиром Путиным его преемника, являются вехой в отступлении этой страны от демократии". Ее соперник Барак Обама добавляет: "Я разочарован тем, что эти выборы не были по-настоящему свободными и честными из-за отсутствия свободных СМИ, преследования лидеров оппозиции и политических партий".

Эксперт по вопросам внешней политики от фракции ХДС в бундестаге Эккарт фон Клэден считает, что российские выборы не являются выборами в полном смысле этого слова. Однако ведущим немецким политикам надо как можно скорее выходить на контакт с будущим российским президентом.

Результаты голосования не принесли ясности. С одной стороны, Медведев — достаточно серьезная фигура и он может не согласиться на сугубо церемониальную роль в Кремле, прогнозируют аналитики. С другой — Путин по-прежнему остается очень влиятельным человеком. Одно неловкое движение — и "штурман" может выкинуть "водителя" из автомобиля, предупреждают зарубежные СМИ.

Под властью "Путмедева" Россия продолжит модернизацию в условиях авторитарного режима, полагает Джонатан Стил, эксперт The Guardian. Медведев не станет преобразовывать российскую политическую систему — он топ-менеджер, а не изобретатель-новатор.

Любопытный вывод делает французская LE FIGARO: "Отныне на российской земле будет править странный "царь" с двумя головами. Одна — 42-летнего юриста Дмитрия Медведева, который не имеет реального опыта политической борьбы и стал президентом в результате процедуры передачи власти, больше напоминающей монархическое престолонаследование, чем всенародные выборы. Другая — обожаемого и всемогущего экс-президента Владимира Путина, который ясно дал понять, что готов стать премьер-министром, чтобы гарантировать преемственность своего курса.

Продержится ли тандем дольше одной весны в России, где традиционно есть место только для одного царя? За кем останется последнее слово, если возникнут разногласия между формальным президентом и "лидером" сегодняшней России? Возможно ли, что сверхпопулярность Путина испарится, как только он лишится административных ресурсов Кремля?

После выборов, не вызвавших ни малейшей искры энтузиазма, так как все было ясно заранее, этот вопрос терзает умы в Москве. Российская политическая сцена моментально перестала казаться стабильной".

Подготовил к печати Сергей ИВАНОВ.

Запад принимает Медведева с оговорками

Западные лидеры поздравили Дмитрия Медведева с избранием на пост президента России, но при этом указали на вопрос о том, насколько справедливой была победа, опиравшаяся в такой большой степени на административный ресурс.

О своей уверенности в развитии связей с Россией заявил глава Еврокомиссии Жозе Мануэль Баррозу. По его словам, стратегическое партнерство между Россией и Евросоюзом должно "основываться не только на взаимных интересах, но и на уважении к ценностям, приверженность которым провозглашена обеими сторонами".

В письме британского премьера Гордона Брауна говорится о надежде на то, что Лондон и Москва смогут восстановить сильно испорченные отношения. Об этом сообщил представитель Брауна Майкл Эллам, который добавил, что британское правительство *"будет судить о новом российском руководстве по его действиям и результатам этих действий"*.

О планах в ближайшее время встретиться с Медведевым и Путиным сообщила канцлер ФРГ Ангела Меркель. Пожелав победителю президентских выборов успехов, она вместе с тем выразила сожаление по поводу *"неспособности международных наблюдателей выполнять свою работу должным образом". "Вне всякого сомнения, во время предвыборной кампании возникали ситуации, в которых демократические правила не всегда соблюдались"*, — заявил представитель канцлера Томас Стег.

"Я знаю, что в ходе выборов не было настоящего соперничества", — сказал глава МИД Франции Бернар Кушнер, комментируя итоги голосования.

Андреас Гросс, глава делегации наблюдателей от Парламентской ассамблеи Совета Европы, единственной группы западных наблюдателей на выборах, заявил, что выборы прошли с повторением ошибок, сделанных во время думской кампании в декабре. Гросс сказал, что результаты выборов в России отражают волю избирателей, однако демократический потенциал был не полностью реализован, сообщает Би-Би-Си.

ПОДРОБНОСТИ

ЧП в Ереване

В ходе беспорядков, происходивших в столице Армении 1 марта, а также в ночь на 2 марта, пострадали 123 человека, восемь человек погибли, сообщает ИА "Новости-Армения" со ссылкой на Министерство здравоохранения республики.

По данным источника, в ночь на 1 марта при разгоне митингов, в которых принимали участие сторонники бывшего президента Левона Тер-Петросяна, травмы получили 42 человека, в том числе 14 сотрудников силовых структур.

Число пострадавших выросло в ходе столкновений между оппозиционерами и полицейскими, произошедших в ночь на 2 марта. Восемь человек, получивших огнестрельные ранения, скончались. По данным ведомства, большинство пострадавших — сотрудники силовых структур.

Сторонники бывшего президента страны Левона Тер-Петросяна, вновь претендовавшего на высший пост страны на выборах 19 февраля, в течение 11 дней проводили акции протеста, требуя пересмотра официальных итогов голосования.

По официальным данным, на выборах уверенно победил Серж Саркисян, занимающий пост премьер-министра: он набрал 53% голосов против 21,5% за Левона Тер-Петросяна.

После столкновений уходящий президент Роберт Кочарян объявил в городе чрезвычайное положение, а парламент страны, собравшись на экстренное заседание ночью, утвердил этот указ.

Чрезвычайное положение предусматривает цензуру средств массовой информации и запрет на собрания; срок действия такого режима установлен до 20 марта.

Левон Тер-Петросян утверждает, что находится под фактическим домашним арестом — сотрудники силовых структур, по его словам, не выпускают его из дому. Власти это отрицают.

Представитель Тер-Петросяна Армен Мусинян в интервью Франс-пресс возложил на власти всю вину за то, что митинги оппозиции закончились насилием. "Чтобы ситуация разрешилась мирно, Левону Тер-Петросяну необходимо иметь возможность говорить со своими сторонниками", — сказал Мусинян.

Как отмечает Рейтер, Тер-Петросян изменил свою изначальную позицию, выразив готовность к переговорам с властями. Ранее он в качестве предварительного условия таких переговоров ставил отмену официальных результатов выборов.

Пресс-секретарь Госдепартамента США Шон Маккормак сообщил, что Вашингтон связывался с обеими сторонами конфликта и призвал их "избежать дальнейшего насилия, действовать всецело в рамках закона, проявить максимальную сдержанность и возобновить политический диалог". Министр иностранных дел Финляндии Илкка Канерва от имени ОБСЕ осудил "применение силы против мирных демонстрантов".

Наблюдатели отмечают, что насилие в Ереване можно сравнить с событиями 1998 года, когда массовые протесты вынудили Тер-Петросяна подать в отставку с поста президента.

Би-Би-Си отмечает, что от возможной нестабильности в стране могут пострадать интересы России, для которой Армения является ключевым союзником в регионе, и в какой-то степени интересы участников различных проектов перекачки каспийской нефти и газа, поскольку Армения расположена близко к маршрутам этих стратегических трубопроводов.

Пан Ги Мун озабочен

Генеральный секретарь ООН Пан Ги Мун выразил озабоченность по поводу столкновений между полицией и сторонниками оппозиции в Ереване. Он потребовал расследовать события, приведшие к гибели 8 человек, и призвал власти Армении как можно скорее отменить чрезвычайное положение, введенное в столице страны 1 марта.

Специальный посланник ОБСЕ, который встретился в Ереване с представителями властей и оппозиции, заявил, что стороны пока не готовы к диалогу.

СТИЛЬ ЖИЗНИ

«Вечные юноши» Италии

Их 10 миллионов. Они не хотят взрослеть. В глубине души они убеждены, что можно продлить юность до появления седых волос. И даже дольше. Это новые 40-летние. Их иногда называют second teen — представители "второго" юношеского возраста.

Каждый второй 40-летний использует компьютер, чтобы отправлять послания в чат. Если говорить точнее, то 52,9% представителей этой возрастной категории, в которую входят мужчины от 35 до 44 лет, регулярно общаются в чатах, и каждый третий (29,1%) использует file sharing, чтобы обмениваться фильмами и музыкой.

Чем занимаются в свободное время 40-летние? Идут в кино, разумеется (58,2%). И почти каждый четвертый (25,9%) невинно сообщает: иду на дискотеку. Если не идут на стадион (41,3% мужчин и 20,9% женщин). Каждый второй 40-летний (52,6%) читает романы, каждый четвертый (24,5%) отдает предпочтение юмористическим произведениям, в то время как каждый третий (31,8%) рассматривает туристические каталоги, а каждый десятый (11,7%) читает комиксы, как и в те времена, когда он был подростком.

Заняться политикой? Нет, сухо отвечает почти каждый третий (28,1% утверждают, что они никогда не говорят о политике). Но это еще не все: каждый пятый (20,5%) не интересуется ничем из того, что происходит на политическом горизонте.

Комик, актер театра и кабаре, он, 40-летний, стал автором книги "20 лет спустя после того, как мне было 20" . Это почти автобиография, написанная как крик о помощи: "Помогите, я же 18-летний юноша, оказавшийся в теле взрослого 39-летнего мужчины". Он, не таясь, признается в том, что "его просто пугают постоянные связи, за исключением тех, что он установил со своим телевизором".

Словом, 40-летние мужчины чаще, чем женщины, хотят жить как вечные юноши. Они бегут от женитьбы. Сколько их? Мужчин-холостяков в возрасте до 44 лет почти в два раза больше, чем женщин: 9% против 5,4%. И из них почти трое из четырех (73,4%) никогда не состояли в браке, против 26,5% разведенных и 0,1% вдовцов. Об этом рассказывает CORRIERE DELLA SERA.

КАЛЕЙДОСКОП

В Пекине открылся крупнейший в мире аэропорт

Он способен выдержать наплыв гостей летней Олимпиады-2008. Об этом сообщает агентство AFP.

Терминалы аэропорта растянулись на 3,25 километра, а его площадь составила 98 гектаров. На его территории могло бы разместиться 170 футбольных полей. Для того, чтобы освободить место для аэропорта, потребовалось переселить около 10 тысяч человек из девяти деревень.

Дизайн крупнейшего в мире аэропорта разрабатывал известный британский архитектор Норман Фостер. Он сделал сооружение похожим на гигантского дракона с длинным хвостом и прозрачной "чешуей" на крыше. Аэропорт был построен менее чем за четыре года, для его возведения использовался труд 50 тысяч рабочих (трое из которых погибли во время постройки).

Когда аэропорт заработает в полную силу, через него каждый день будут проходить примерно 208 тысяч пассажиров.

Чудо-очки

Специалисты Токийского университета разработали специальные очки, которые без труда отыщут потерянный пульт дистанционного управления от телевизора, мобильный телефон или даже молоток.

Эти окуляры напоминают очки для подводного плавания, передает ИТАР-ТАСС. Они делают видеозапись всего, что попадает в поле зрения человека, их надевшего.

Чтобы найти потерянную вещь, нужно ввести название интересующего предмета.Устройство почти мгновенно определит фрагмент видеозаписи, где он появлялся в последний раз, и прокручивает ее на небольшом экране, зафиксированном у правой линзы очков.

Система не привязывает название к конкретному объекту, она умеет также распознавать различные предметы, которые могут внешне немного отличаться, но называются одинаково. Экспериментальная модель помнит около 60 названий.

Опасные роботы

Профессор Шеффилдского университета Ноэл Шарки выступил с предостережениями в связи с возможным развязыванием новой гонки вооружений в области роботизированных систем.

Как отмечает британский ученый, в настоящее время многие страны мира разрабатывают технологии для создания боевых роботов. Лидером в данной области являются Соединенные Штаты. Они инвестируют в разработку подобных устройств около 4 миллиардов долларов до 2010 года.

На данный момент в Ираке развернуто более четырех тысяч роботов. Пока принятие решения о применении средств поражения остается за человеком. Однако в будущем ситуация может радикально измениться. Уже сейчас США считают приоритетом создание полностью автономных боевых систем. Это означает, что роботы будут сами определять, где и кого следует уничтожить.

Помимо США программы разработки дистанционно управляемых боевых систем реализуются рядом европейских стран, а также Россией, Канадой, Южной Кореей, Китаем, Сингапуром, ЮАР, Израилем и Индией.

По мнению Шарки, главная опасность состоит в том, что копирование однажды разработанных систем легко может выйти из-под контроля. При этом в результате все более широкого распространения технологий и снижения их стоимости возрастает и угроза попадания боевых роботов в руки террористов, которые могут использовать их вместо смертников.

Между двух огней

Президент Ирана Махмуд Ахмадинежад встретил теплый прием в столице соседнего Ирака. Президенты исламской республики никогда ранее не посещали соседнюю страну, а в 1980-е годы Тегеран и Багдад вели ожесточенную войну. Она надолго омрачила отношения двух стран, и двухдневный визит Ахмадинежада стал важным подтверждением их нормализации.

Ахмадинежад назвал свою поездку новой страницей в отношениях Ирака и Ирана. "У нас одинаковое понимание вещей, и две стороны полны решимости укреплять свое политическое, экономическое и культурное сотрудничество", — заявил он на совместной пресс-конференции с иракским коллегой Джалялем Талабани.

Иракское правительство парадоксальным образом оказывается союзником одновременно и Вашингтона, и Тегерана, отмечает корреспондент Би-Би-Си в Тегеране Джон Лайн. Кроме того, по мнению многих аналитиков, несмотря на нынешнее примирение, в долгосрочной перспективе Ирак и Иран станут соперниками как две крупнейшие страны в регионе.

21-летний британец в седьмой раз стал отцом

Об этом сообщила британская телерадиокорпорация Би-Би-Си.

Первый ребенок появился у Кита Макдональда еще восемь лет назад, когда ему было 13 лет. Матерями всех детей молодого британца, которого за "подвиги" местные жители прозвали "беззаботным Ромео", являются взрослые женщины. Макдональд в настоящее время не работает и, соответственно, не дает им денег на содержание детей. По словам многодетного отца, в восьмой раз становиться отцом он не намерен. Мать Макдональда, она же бабушка семерых внучков и внучек, не довольна, по всей вероятности, таким положением дел и посоветовала беззаботному сыну "завязывать с этим делом".

Откусил руку

В китайской провинции Аньхой цирковой лев откусил руку десятилетнему мальчику, сообщает агентство Reuters.

Принадлежащее цирковой труппе животное схватило мальчика, посещавшего парк развлечений, и затащило его в клетку. Ребенка смогли отбить у льва, но тот успел откусить ему руку. Пострадавшего доставили в больницу и сделали ему операцию.

По мнению полиции, расстояние между прутьями клетки льва было слишком велико. В Китае небрежность в соблюдении техники безопасности часто становится причиной подобных происшествий. Так, минувшей осенью в пекинском зоопарке панда до костей обгрызла ноги забравшемуся в ее вольер подростку.

В апреле 2007 года 16 китайских чиновников были уволены после того, как цирковые крокодилы живьем съели девятилетнего мальчика. А в феврале того же года тигр убил шестилетнюю китайскую девочку, которая хотела сфотографироваться с ним в парке развлечений.

Народная Воля http://www.nv-online.info
7 САКАВІКА 2008 г.

НУ І НУ!

Падатак на жыццё

Не іначай як здзек і блюзнерства можна расцэньваць дзеянні падатковай інспекцыі Сенненскага раёна Віцебшчыны, якая запатрабавала 45 мільёнаў падатку з мясцовых жыхароў сужэнцаў Алы і Аляксандра Небакаткіных за сабраныя імі добраахвотныя ахвяраванні на аперацыю па ўратаванні іхняга хлопчыка ад немінучай смерці.

Арцёмка нарадзіўся з цяжкай паталогіяй жоўцевых пратокаў, якая праз 2 гады прывяла да цырозу печані. Розныя дактары аднадушна выносілі малому смяротны прысуд, але бацькі не захацелі прымірыцца з гэтым. Даведаўшыся, што сына можа ўратаваць перасадка печані, яны вырашылі дамагчыся гэтага. Небакаткіны разумелі, што ў Сянно не назбіраюць суму, неабходную для аперацыі за мяжой, і звярнуліся праз сродкі масавай інфармацыі па дапамогу да ўсіх добрых людзей Беларусі.

І адбыўся цуд: беларусы талакой сабралі для Арцёмкі патрэбную суму. У Маскве хлопчыка прааперыравалі, перасадзіўшы яму частку печані ягонай маці. Аперацыя прайшла паспяхова, але для поўнага выздараўлення хлопчыка гэтага недастаткова. Цяпер бацькам трэба рэгулярна вазіць Арцёмку на кансультацыі ў Маскву, набываць для яго дарагія прэпараты. На гэта патрабуюцца вялікія грошы, а сродкі, ахвяраваныя Небакаткіным, падышлі да канца. Гэта асабліва крыўдна, бо хлопчык пачаў папраўляцца і пакрысе даганяць у развіцці сваіх аднагодкаў.

І вось тут лёс падкінуў Небакаткіным новае выпрабаванне — 45 мільёнаў падатку на грошы, якія прыходзілі на дабрачынны рахунак у банк з усіх куткоў Беларусі.

Але і гэта яшчэ не ўсё. Паколькі сродкі працягвалі паступаць і пасля аперацыі, банк цяпер затрымлівае выдачу Небакаткіным пазнейшых пералічэнняў, спасылаючыся на тое, што гэтыя грошы Але і Аляксандру ўжо не патрэбны: аперацыя, маўляў, зроблена. А пакуль у банку вырашалі ці аддаваць Небакаткіным усе пералічаныя для іх грошы, падатковая інспекцыя патрабавала, каб сужэнцы заплацілі падатак і з той сумы, што паступіла ў банк пасля аперацыі і якую Небакаткіны, магчыма, не атрымаюць.

У сувязі з гэтай прыкрай сітуацыяй так і хочацца запытаць у тых, хто сядзіць на самым версе ўлады: няўжо нашай дзяржаве так непатрэбна жыццё чалавека, што за ягонае ўратаванне трэба спагнаць падатак? А яшчэ цікава было даведацца, чаму вызвалены ад падатку прызёры "Суперлато"?

Зрэшты, пытанні гэтыя рытарычныя, адказы на іх, так бы мовіць, лунаюць у паветры. Кіраўніцтву краіны патрэбна шмат грошай цяпер і зараз, а што будзе з асобна ўзятым хворым Арцёмкам, уладу не хвалюе.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

ЧУЛІ?

Атрымаць правы стане даражэй

Паслугі па навучанні кіраванню механічнымі транспартнымі сродкамі выключаны з пераліку паслуг, цэны на якія рэгулююцца Саветам міністраў. Адпаведны ўказ падпісаны Аляксандрам Лукашэнкам. Пасля прыняцця гэтага ўказа чакаецца скарачэнне чэргаў на навучанне, якія цяпер дасягаюць васьмі месяцаў, аднак і значнае павелічэнне кошту навучання ў аўташколах.

Кошт навучання ў беларускіх аўташколах узрасце і можа скласці прыблізна мільён рублёў і больш з улікам кошту паліва. Такое меркаванне БелаПАН выказаў начальнік аддзела па бяспецы на транспарце і ліцэнзаванні Міністэрства транспарту і камунікацый Павел Бажанаў.

Пры гэтым ён падкрэсліў, што сёння складана назваць канкрэтныя лічбы магчымага росту кошту навучання. Аўташколы павінны будуць узгадняць і рэгістраваць тарыфы ў выканкамах і абгрунтоўваць іх рост. *"Мы не адпускаем тарыфы ў вольнае плаванне, а проста мяняем від дзяржаўнага рэгулявання — са спецыяльнага на звычайны, калі тарыфы на паслугі рэгіструюцца ў выканкамах"*, — зазначыў П.Бажанаў.

Ён таксама сказаў, што ў любым выпадку ніхто ў аўташколах "замежавыя" тарыфы ўстанаўліваць не будзе, бо гэта можа выклікаць адток тых, хто жадае атрымаць вадзіцельскія пасведчанні.

Аляксей АРЭШКА.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Перапалохаліся?

Канстытуцыйны суд адмовіўся разглядаць зварот больш як 50 тыс. беларускіх грамадзян аб унясенні змяненняў у "рэлігійнае" заканадаўства. Адказ з КС паступіў у мінскую царкву "Новае жыццё" рэлігійнага аб'яднання абшчын хрысціян поўнага Евангелля ў Рэспубліцы Беларусь.

У адказе, у прыватнасці, гаворыцца, што для ацэнкі адпаведнасці Канстытуцыі таго ці іншага закона неабходны зварот у КС дзяржаўных органаў і службовых асоб, у тым ліку ўрада і прэзідэнта. Аўтары адказу тлумачаць, што грамадзяне не маюць такой магчымасці, аднак могуць звярнуцца ва ўрад і да прэзідэнта з просьбай скарыстацца сваім правам і ўнесці адпаведныя прапановы ў КС у сувязі са зваротам грамадзян.

У інтэрв'ю БелаПАН каардынатар кампаніі па абароне правоў на свабоду сумлення Сяргей Луканін падкрэсліў, што ў звароце грамадзян адсутнічала просьба ацаніць на адпаведнасць Канстытуцыі закон "Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях". Паводле яго слоў, у звароце зазначана, што ў адпаведнасці з заканадаўствам КС мае права ўносіць прэзідэнту краіны прапановы аб неабходнасці змяненняў і дапаўненняў у заканадаўства, а таксама прыняцця новых нарматыўных прававых актаў.

"Айчыннае заканадаўства не забараняе Канстытуцыйнаму суду па ўласнай ініцыятыве ацэньваць адпаведнасць таго ці іншага закона Канстытуцыі", — сказаў С.Луканін.

Паколькі, зазначыў каардынатар, без выканання спецыяльнай працэдуры грамадзяне не маюць права напрамую звяртацца ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу з заканадаўчай ініцыятывай, у звароце ўтрымліваецца просьба ў КС скарыстацца сваім правам і накіраваць у ніжнюю палату парламента адпаведную заяву са зваротам больш як 50 тыс. грамадзян.

С.Луканін падкрэсліў, што Асноўны закон надзяляе такую колькасць грамадзян правам заканадаўчай ініцыятывы. *"Аднак у Канстытуцыі не згадана, якія яшчэ працэдуры павінны выканаць грамадзяне, каб скарыстацца гэтым правам. А закон "Аб парадку рэалізацыі права заканадаўчай ініцыятывы грамадзянамі Рэспублікі Беларусь" на практыцы робіць немагчымай рэалізацыю гэтага права, паколькі патрабуецца папярэдняя падрыхтоўка законапраекта, яго экспертыза ў Міністэрстве юстыцыі, рэгістрацыя ініцыятыўных груп і г.д."*, — сказаў С.Луканін.

Паводле яго слоў, кампанія па абароне правоў на свабоду сумлення з'яўляецца унікальнай па колькасці сабраных подпісаў грамадзян. *"Аднак Канстытуцыйны суд праігнараваў ініцыятыву суайчыннікаў, маючы законную магчымасць пайсці ім насустрач і ўпершыню ў гісторыі Беларусі стварыць прэцэдэнт нарматворчага дыялогу паміж кампетэнтнымі дзяржаўнымі органамі і грамадствам"*, — лічыць С.Луканін.

Марат ГАРАВЫ.

КАМАНДЗІРОЎКА

Ля разбуранага храма...

Рэпарцёр "Народнай волі" ў рамках медыя-кампаніі, якую праводзіць Беларуская асацыяцыя журналістаў "Журналісты за гістарычную спадчыну", наведаў помнікі гісторыі Віцебскай вобласці.

Зембін

У мястэчку Зембін знаходзіцца касцёл Узыходжання Найсвяцейшай Панны Марыі, які быў пабудаваны ў 1790—1809 гадах. Мы яго спачатку пераблыталі з амаль цалкам разбуранай царквой, падобнай на уніяцкую. Бачна, што тут таксама прымаліся пэўныя меры дзеля рэканструкцыі, якія не далі ніякіх вынікаў. Будаўнічы бруд дапаўняе агульную атмасферу разбурэння і запушчанасці. Там, дзе размяшчаліся богаслужэбныя памяшканні, у якія забаронены ўваход простым вернікам, на сценах замест абразоў кідаюцца ў вочы надпісы кшталту "Паша+Вова=Дружба". Неяк не хочацца верыць, што сапраўдныя сяброўства і каханне павінны знаходзіць сваё адлюстраванне ў такім здзеку са святых сцен, веліч якіх уражвае нават зараз, калі яны, здаецца, могуць у любы момант абрынуцца і пахаваць пад сабою выпадковага наведвальніка.

Сітуацыя з вышэйзгаданым касцёлам, прыгажосць якога, як кажуць, уразіла самога Напалеона, які непадалёк ад Зембіна перапраўляўся цераз Бярэзіну, трагічная ўвогуле. Нейкім цудам ацалелі толькі сцены і скульптура Божай маці на франтоне, над якой звілі гняздо буслы. Здаецца, што гэтыя сцены маўкліва стогнуць ад абурэння чалавечай бездухоўнасцю і абыякавасцю.

20 гадоў таму касцёл хацелі папросту ўзарваць: камісія зрабіла выснову, што знаходзіцца там небяспечна, таму што фундамент прасеў, а сцяна на вуліцу нахілілася. Але ў 1999 годзе храм было вырашана рэканструяваць на сродкі вернікаў. Быў узведзены цэнтральны купал з крыжам, навокал з'явіліся будаўнічыя рыштаванні. Але нечакана рэстаўрацыя скончылася, з'ехалі ў невядомым накірунку будаўнікі... А храм так і стаіць, нібы аголены. У роспачы глядзіць у нябёсы Божая Маці.

Сітуацыя ўнутры проста жудасная... Храм ператвораны літаральна ў грамадскую прыбіральню! Паўсюль валяюцца пустыя бутэлькі ад спіртных напояў на любы густ, пачынаючы ад шампанскага і заканчваючы "пладова-выгаднай" асалодай пэўных колаў пралетарыяту. А ступіўшы колькі крокаў убок, можаш нечакана высветліць, што стаіш літаральна на магіле, а з густых зараснікаў у некаторых месцах выглядаюць заімшэлыя камяні, пад якімі, магчыма, знайшлі спакой духоўныя айцы, з вуснаў якіх гучала ў касцёле слова Божае. А можа, калісьці тут проста быў могільнік, які станавіўся апошнім прытулкам для жыхароў Зембіна і ваколіц. На жаль, надпісы на камянях ужо немагчыма прачытаць. Могілкі паступова робяцца сметнікам, здаецца, што павага да мёртвых ужо не з'яўляецца духоўнай каштоўнасцю для жывых.

Канешне, хацелася б даведацца, чаму так нечакана была закінутая рэканструкцыя гэтага велічнага касцёла, але што тут здзіўляцца, напэўна, лядовыя палацы краіне патрэбны больш...

Бягомль

У Бягомлі пануе атмасфера стрыманасці і няспешнасці. Вядома, пэўная дынаміка тут адчуваецца — спяшаюцца па сваіх справах жыхары, крочаць у школу дзеці з флікерамі. Тут знаходзіцца царква Усіх Святых, пабудаваная ў 1877—1986-х гадах. У савецкія часы царква была ператворана ў вытворчае памяшканне.

Пытаемся ў сустрэчных бабуль: "Скажыце, а дзе ў вас тут разбураная царква?" Адказваюць: "Дзе разбураная — не ведаем, а службы адбываюцца ў царкве, якая знаходзіцца вунь там", — і паказваюць, куды трэба рухацца, каб трапіць да царквы.

Калі трапляем на месца, разумеем, што храм менавіта той, які мы шукалі. Частка царквы функцыяніце, але на службу патрапіць не давялося, дзверы зачыненыя. А вось з другога боку царква насамрэч разбураная, праўда, не да такой ступені, як у Зембіне. Ствараецца ўражанне нейкай "апалавіненасці" царквы. Спераду — магутнае культавае збудаванне з бутавага каменя, а ззаду — голыя сцены, абсыпаныя камяні. Напрошваецца вывад, што рэканструкцыя магчымая, але вось толькі не хапае ці то сродкаў, ці то жадання. А магчыма, вінаватая ва ўсім проста абыякавасць мясцовых і рэспубліканскіх улад.

Акрамя царквы, у Бягомлі захаваліся спіртавы завод і гаспадарчыя пабудовы, якім таксама больш за 120 гадоў.

Лепель

У чымсьці Лепель — тыповы раённы цэнтр з вялікім помнікам Леніну ў цэнтры горада. Насамрэч, горад мае багатую гісторыю. Першая згадка пра Лепель адносіцца да 1439 года. Горад належаў вялікім князям літоўскім, Віцебскаму касцёлу, Віцебскаму кафедральнаму сабору, полацкаму ваяводзе Мікалаю Дарагастайскаму, Льву Сапегу, віленскім законніцам-бернардынкам. Пасля далучэння Беларусі да Расіі ў 1772 годзе Лепель застаўся ў складзе Літвы, а пасля другога падзелу Рэчы Паспалітай быў далучаны да Расіі. Падчас вайны 1812 года Лепель быў спалены.

У Лепелі захавалася царква Параскевы Пятніцы XIX стагоддзя. Вельмі дзіўна, што час, які бязлітасна абыходзіцца з мураванымі збудаваннямі, пашкадаваў драўляную царкву. А можа, справа зусім не ў часе, а ў трапяткім стаўленні да яе кліру і прыхаджан?

У царкве рэгулярна адбываюцца набажэнствы, традыцыйныя праваслаўныя абрады: вянчанне, хрышчэнне, адпяванне. Пры царкве працуе крама, дзе можна набыць неабходную культавую атрыбутыку. Побач, у асобным будынку, размешчаны духоўны цэнтр, дзе праходзяць заняткі нядзельнай школы, сярод выхаванцаў якой рэгулярна адбываюцца конкурсы малюнкаў і мастацкіх вырабаў на рэлігійную тэматыку. Бачна, што прыхаджане, якія рэгулярна наведваюць храм, не шкадуюць для яго свайго часу і ахвяраванняў.

Праўда, старыя абразы ў храме цяжка заўважыць. Унутры ўсё выглядае вельмі мадэрнова.

Але факт застаецца фактам — тут людзі клапоцяцца пра сваё духоўнае багацце.

Бешанковічы

Самы высокі будынак у Бешанковічах — Ільінская царква 1866 года. Яе пяць купалоў магутна ўзвышаюцца над прыватнай забудовай. Адчуваецца ў гэтым храме годнасць і веліч. На жаль, не давялося пабачыць, як ён выглядае знутры.

Дзіўна, але пра месца знаходжання самага цікавага ў Бешанковічах месца — палаца Храптовічаў 1770 года, у якім у розны час начавалі Напалеон і Аляксандр I, — у мясцовых жыхароў было вельмі складана дапытацца. У адказ на пытанне пра палац многія проста разводзілі рукамі. Аказваецца, многія лічаць яго не палацам, а "панскім домам". Зараз у адным з будынкаў палацавага комплексу размясцілася дзіцячая музычная школа. Захаваўся і ажурны балкон (на якім, магчыма, Напалеон піў раніцай каву). Калісьці вакол палаца быў цудоўны парк з некалькімі сажалкамі. У прынцыпе, парк у Бешанковічах і зараз выглядае няблага. Тут можна хадзіць гадзінамі, каб прывесці ў парадак стомленую дынамізмам сучаснага жыцця і ўсім набалелым нервовую сістэму. А ўлетку тут увогуле цудоўна. Упрыгожваюць парк драўляныя скульптуры, якія вылучаюцца вельмі яркімі і прывабнымі колерамі. У асноўным гэта персанажы дзіцячых казак, таму для маленькіх жыхароў Бешанковічаў кожнае наведванне гэтага месца ператвараецца ў сапраўднае казачнае падарожжа.

Іллінская царква — самы высокі будынак у Бешанковічах.

Царква ў Бягомлі: выгляд спераду (здымак зверху) і ззаду...

Полацк

Гэты горад вабіць да сябе... Менавіта тут пачыналася беларуская гісторыя. На жаль, за адзін дзень немагчыма ў поўнай меры атрымаць асалоду ад усіх знакавых месцаў гэтага горада-музея. Дарэчы, музеяў у Полацку больш, чым у Мінску. Здаецца, што ўначы па вуліцах тут блукаюць здані мінулага, настолькі багатая знакавымі постацямі гісторыя полацкай зямлі. Некаторыя з іх увасоблены ў помніках: Еўфрасіння Полацкая, Усяслаў Чарадзей, Францыск Скарына,Сімяон Полацкі. Аб іх вялікіх дзеях на карысць роднай зямлі ведае кожны свядомы беларус. Не хопіць шматлікіх кніжных тамоў, каб увасобіць у іх усю слаўную гісторыю горада на берагах Палаты.

Не так даўно ў Полацку адчыніўся новы музей ці хутчэй выстава пад назвай "Эпоха Леніна". Уваход сюды абсалютна бясплатны. Гэта прыватная калекцыя Мікалая Панкрата, якая месціцца на тэрыторыі яго ўласнага жытла. Калекцыя актыўна папаўняецца экспанатамі, і таму жонка Мікалая ўжо вынесла яму папярэджанне пра тое, што не дазволіць адводзіць пад яе больш за 1/3 частку дома. У калекцыі каля 400 бюстаў Леніна. Збірае Мікалай таксама выявы Сталіна, Горкага і Дзяржынскага.

Як кажа сам Мікалай: *"Я раблю гэта проста так, для сябе. Гэта ніяк не звязана з палітыкай — я калекцыянер. І каму гэта ўвогуле, акрамя мяне, зараз патрэбна? Проста зараз усе робяць выгляд, быццам мы не жылі тым жыццём. Напрыклад, я ніколі не быў камуністам. Я проста калекцыянер. А ўвогуле, хіба шмат чаго змянілася ў нашым жыцці?"*

Некаторыя вялікія экспанаты выстаўлены проста на вуліцы перад домам. На пытанне пра магчымасць крадзяжу Мікалай са смехам адказвае:*"Хай паспрабуюць знесці. Асабліва экспанат, які важыць 200 кілаграмаў"*.

Калекцыю сваю Мікалай і далей плануе папаўняць. А пакуль у гэты своеасаблівы музей нярэдка завітваюць прадстаўнікі старэйшага пакалення, каб са слязьмі на вачах паспяваць "Орленка" ды пакінуць падзяку ў Кнізе для наведвальнікаў кшталту *"Дзякуй за тое, што вярнулі нас у часы свабоды і дэмакратыі"*. Ну што ж, у кожнага свой погляд на такія рэчы...

З музея Мікалая Панкрата мы адразу накіраваліся ў Спаса-Еўфрасіннеўскую царкву... Менавіта тут малілася за род людскі слаўная ўнучка Усяслава Чарадзея Еўфрасіння Полацкая. Тут захоўваюцца яе мошчы і копія арыгінальнага крыжа, які быў страчаны падчас Другой сусветнай вайны. Прападобная Еўфрасіння і зараз працягвае дапамагаць людзям — цудоўныя вылечванні нярэдка здараюцца ў гэтым святым месцы. Кажуць, не так даўно дзяўчынка з расійскага горада Электрасталь, якая ўжо не магла самастойна рухацца і якой не маглі дапамагчы ўрачы, поўнасцю вылечылася ад чырвонай ваўчанкі.

У царкве фрэскі XIX стагоддзя чаргуюцца з фрагментамі фрэсак XII стагоддзя. Толькі экскурсантаў вельмі просяць не дакранацца да сцен. Нават самы лёгкі дотык можа нанесці непапраўную шкоду старажытным творам мастацтва.

Перад візітам у Полацк А.Лукашэнкі хадзілі чуткі аб рэканструкцыі царквы. Да прыкладу, планавалася зрабіць цёплую падлогу, пакрытую пліткай "Керамін", але, відаць, епархіяльнае і свецкае кіраўніцтва зразумела, што тэмпературны перапад проста знішчыць старажытныя фрэскі. А можа, гэтага не адбылося з-за зацікаўленасці ў дадзеным архітэктурным помніку фонду ЮНЕСКА. Вось толькі купал усё ж быў зменены на залаты, які ніяк не ўпісваецца ў канцэпцыю царквы.

Пра царкву і дзейнасць Еўфрасінні Полацкай нам распавядала паслушніца Юлія. Вельмі шкада, што манашак у Спаса-Еўфрасіннеўскім манастыры нельга фатаграфаваць. Проста немагчыма забыць тую цудоўную цеплыню, якая свяцілася ў вачах Юліі, ад такіх людзей сыходзіць сапраўдная духоўнасць. Як кажа яна сама: *"Жаданне пайсці ў манастыр узнікла ў мяне яшчэ ў 12 гадоў. Сама я з Мінска, скончыла Акадэмію музыкі па класе фартэпіяна. Але няма ў свеце акадэміі вышэйшай за манастыр. Кожны з нас тут мае пэўныя абавязкі. Напрыклад, я займаюся дзіцячым хорам, праводжу экскурсіі. Пастрыжэння мы ўсе чакаем як вышэйшага шчасця. У манастыры я ўжо чатыры гады"*.

Вельмі не хацелася так хутка пакідаць гэты цудоўны горад, дзе жывуць шчырыя людзі і дзе мінулае так гарманічна суіснуе з сучасным.

Глыбокае

Глыбокае вельмі багаты на помнікі даўніны, але, на жаль, тут мы затрымаліся ненадоўга і сканцэнтравалі ўсю сваю ўвагу на помніку архітэктуры 2-й катэгорыі, з якім абышліся проста падзікунску, пакінуўшы яго на разбурэнне ад часу ды неспрыяльных прыродных умоў.

Гаворка ідзе пра корпус манастыра кармелітаў, што захаваўся побач з Саборам Нараджэння Божай Маці. Тут начаваў Напалеон, які па легендзе падараваў манахам паднос з золатам і сказаў, што, калі б гэта было магчыма, ён перанёс бы іх касцёл на далоні і паставіў бы побач з Нотр-Дам...

Як сцвярджае журналіст і краязнаўца Уладзімір Скрабатун, *"менавіта ў гэтым будынку Мураўёў-вешальнік выносіў прысуды паўстанцам 1831-га і 1864 гадоў, і, магчыма, гэтыя сцены дагэтуль чуюць іх стогны"*.

Уладзімір кажа, што неаднаразова ставіў перад глыбоцкімі ўладамі пытанне аб гістарычнай значнасці дадзенага помніка архітэктуры, але так і не знайшоў ні кроплі падтрымкі. Будынак тым часам разбураецца, старадаўняя цэгла мяшаецца з сучаснай, усё хутчэй распаўсюджваюцца бруд і вільгаць.

Варты ўвагі і той факт, што Сабор Нараджэння Божай Маці ў Глыбокім 1639 года пабудовы калісьці быў касцёлам. У 1735 годзе яго перабудоўваў знакаміты віленскі архітэктар Ян Глаубіц. Да гэтай перабудовы ўваход быў з адваротнага боку, а алтар быў там, дзе зараз уваход. Атрымоўваецца, што царква мае 4 вежы — дзве ў стылі сармацкага барока і дзве ў стылі позняга барока.

Мосар

Напрыканцы паездкі хацелася пабачыць што-небудзь па-сапраўднаму аптымістычнае. А Мосар выклікае толькі станоўчыя эмоцыі, і ў параўнанні з тым жа Зембіным выглядае проста раем на зямлі. І ўсё дзякуючы намаганням аднаго чалавека — ксяндза Юзафа Булькі, які сілаю сваёй веры і перакананасці здолеў адвучыць ад алкаголю жыхароў некалькіх навакольных вёсак, звярнуць і моладзь, і старэйшых на сапраўдны шлях, які даспадобы Богу. Прыгажосць касцёльнага саду, які стварыў Булька, проста не паддаецца ніякім апісанням — усё трэба пабачыць на ўласныя вочы. Тут па-сапраўднаму адчуваецца еўрапейская дбайнасць і гасціннасць, якой часам так нестае кіраўніцтву нашай дзяржавы. А калі слухаеш казань Юзафа Булькі і бачыш, з якім замілаваннем слухаюць яе ўсе астатнія, разумееш, што жывая ў сэрцах беларусаў дарога да Бога. Галоўнае, на ўласным прыкладзе паказаць іншым усю яе велічнасць. Таму нам усім трэба далучацца да справы аднаўлення гістарычнай спадчыны, каб было што з годнасцю перадаць наступным пакаленням.

Ірына МУРАЎЁВА.
Фота аўтара.

Падлічылі...

У гэтым годзе ўрад збіраецца надаць асобую ўвагу развіццю малых гарадоў і населеных пунктаў. Тым часам эксперты ўжо прааналізавалі, дзе ў беларускай правінцыі жыць найгорш, а дзе — найлепш.

Самая малая сярэдняя заработная плата (па афіцыйных звестках за снежань 2007 г. — у тысячах рублёў)

1. г.п.Стрэшын (Гомельская вобл.) 318
2. п.Ільіч (Гомельская вобл.) 334,5
3. г.п.Радунь (Гродзенская вобл.) 383
4. г.Барань (Віцебская вобл.) 401
5. п.Бігасава (Віцебская вобл.) 404
6. г.п.Лынтупы (Віцебская вобл.) 406
7. г.п.Яновічы (Віцбская вобл.) 410
8. г.п.Любча (Гродзенская вобл.) 410
9. г.п.Вострына (Гродзенская вобл.) 416
10. г.п.Відзы (Віцебская вобл.) 437

Самая высокая сярэдняя заработная плата (па афіцыйных звестках за снежань 2007 г. — у тысячах рублёў)

1. п.Касцюкоўка (Гомельская вобл.) 1100
2. г.п.Урэчча (Мінская вобл.) 1100
3. г.п.Краснасельскі (Гродзенская вобл.) 1020
4. г.Мікашэвічы (Брэсцкая вобл.) 935
5. г.Белаазёрск (Брэсцкая вобл.) 895
6. г.Валожын (Мінская вобл.) 890
7. г.Любань (Мінская вобл.) 880
8. г.Заслаўе (Мінская вобл.) 860
9. г.Асіповічы (Магілёўская вобл.) 841
10. г.Бяроза (Брэсцкая вобл.) 830

ВІНШУЕМ!

Квяткоўскі і Харэўскі знайшлі сваю «залатую літару»

Літаратурную прэмію "Залатая літара" атрымалі журналіст Севярын Квяткоўскі за кнігу "Фрашкі да пляшкі" і гісторык Сяргей Харэўскі за падручнік "Гісторыя мастацтва і дойлідства Беларусі".

Цырымонія ўзнагароджання прайшла ў Мінску.

Як заявіў Севярын Квяткоўскі, ён не чакаў, што прэмія будзе ўручана яму за кнігу нататкаў аб жыцці вядомых людзей. *"У прынцыпе, гэта кніга была вытрымана ў своеасаблівых "замалёўках". Наогул "Фрашкі да пляшкі" — гэта застольныя гісторыі, якія людзі расказваюць за святочным сталом. Было вельмі складана ўпісаць некаторыя гісторыі ў кантэкст, у адну кнігу. Але я думаю, што гэта атрымалася"*, — сказаў С.Квяткоўскі.

"Я не думаў, што мая кніга будзе прадавацца ў кнігарнях. Тым не менш... Сярод чытачоў — і 14-гадовыя падлеткі, і 80-гадовыя пенсіянеры", — зазначыў С.Квяткоўскі.

С.Харэўскі канстатаваў, што ў Беларусі выдаецца вельмі мала гістарычнай літаратуры. *"Таму мая кніга — гэта дапамога тым студэнтам, якія вучацца на маім курсе ў Еўрапейскім гуманітарным універсітэце ў Вільнюсе і ў Беларускім калегіуме. Папярэднія кнігі па гісторыі архітэктуры былі выпушчаны ў 1986 годзе, і гэта быў шасцітомнік"*, — сказаў С.Харэўскі.

Заснавальнік прэміі Адам Глобус зазначыў, што гэта прэмія была заснавана ў 2004 годзе. *"Проста я адышоў ад такой традыцыі, калі ўсё вырашае нейкае журы. Калі лаўрэатаў вызначаюць усе — гэта значыць, што за вынік не адказвае ніхто. Таму я вырашыў, што пераможцаў такой прэміі буду выбіраць толькі я, і адказнасць за яе лаўрэатаў будзе ўскладзена толькі на мяне"*, — заявіў А.Глобус.

"Сёлета прэмію атрымалі Квяткоўскі і Харэўскі. Таму я ведаю, што трэцяя частка кніг, якія наогул прадаюцца ў свеце, — гэта падручнікі. І падручнік Харэўскага — адзін з лепшых, якія я бачыў апошнім часам. А кніга Севярына — гэта тое, што павінна дарыць людзям літаратура: яна павінна дарыць людзям весялосць і радасць. Таму атрымальнікамі прэміі і сталі гэтыя два чалавекі", — сказаў А.Глобус.

Лаўрэаты прэміі атрымалі з рук А.Глобуса штотыднёвікі на 2008 год і фотаальбомы жонкі Глобуса Алены Адамчык з фатаграфіямі вядомых беларускіх жанчын.

Сяргей ПУЛЬША.

И ТАК БЫВАЕТ

Минчанину за «валентинки» грозит до 800 долларов штрафа

От 30 до 50 базовых величин — такой штраф грозит молодому минчанину, который накануне Дня святого Валентина раскрасил краской подъезд в доме №18 на улице Козыревской.

22-летний парень решил признаться девушке в любви необычным способом: на внешней стене подъезда он нарисовал 20 валентинок, а на тротуаре оставил любовное послание. Вскоре нарушителя задержали.

Теперь ему грозит административная ответственность за "умышленное уничтожение или порчу имущества". Его могут оштрафовать на 1 миллион 750 тысяч рублей. Помимо того, ему придется оплатить расходы за косметический ремонт подъезда — еще около 350 тысяч рублей.

Народная Воля http://www.nv-online.info
7 САКАВІКА 2008 г.

ЧУЛІ?

Гродзенскі дзяржаўны універсітэт падвысіў кошт навучання

Студэнты Гродзенскага універсітэта пасля адмены льгот атрымалі чарговы *"падарунак"* ад кіраўніцтва навучальнай установы, і цяпер сума штомесячнай аплаты за навучанне складае сярэднямесячны заробак маладога спецыяліста на пасадзе школьнага настаўніка.

Студэнтам платнай формы навучання зараз замест 110 долараў штомесяц прыйдзецца плаціць 135.

Падвышэнне аплаты за навучанне для студэнтаў Гродзенскага універсітэта на 25 долараў абумоўлена перш за ўсё ўказам прэзідэнта краіны №450 *"Аб даплатах за вучоныя ступені"*, згодна з якім выкладчыкам навучальных устаноў паднялі заробкі. Як высветлілася, не за бюджэтныя сродкі, а за кошт студэнтаў і іх бацькоў. Менавіта так тлумачыць сітуацыю прарэктар па адміністрацыйным і эканамічным развіцці навучальнай установы Васіль Сянько.

— Я не бачу тут нічога супрацьзаконнага. На працягу месяца загад рэктара прайшоў праверку ў Міністэрстве адукацыі. Мы вымушаны падвышаць заробкі выкладчыкам, і з-за недахопу бюджэтнага фінансавання даводзіцца вырашаць праблему такім чынам, — сказаў чыноўнік "Радыё Рацыя".

СІТУАЦЫЯ

Ці ты Ясь, ці ты не?

Гэты здымак вельмі часта можна бачыць на старонках польскіх газет і на польскіх тэлеканалах. 10-месячнаму Ясю, як яго называюць у польскай прэсе, пагражае дэпартацыя ў Беларусь. Праўда, суд у Любліне, зважаючы на здароўе дзіцяці, прыпыніў рашэнне аб дэпартацыі, якое сам жа прыняў 7 лютага.

Хлопчык нарадзіўся ў люблінскім Дзіцячым клінічным шпіталі. Ён адзін з двух блізнятаў, які выжыў пры родах. Маці яго — грамадзянка Беларусі — адмовілася ад дзіцяці. Яго ўсынавіла жыхарка горада Гдыні, але потым таксама адмовілася ад апекі. Зараз яна шукае іншую сям'ю, якая пагодзіцца апекаваць хлопчыка, які пакутуе на распаўсюджанае генетычнае захворванне — мукавісцыдоз. Хвароба, у прыватнасці, выклікае назапашванне ў органах дыхання слізі, якую трэба пастаянна выдаляць. І рабіць гэта трэба ў клінічных умовах.

У студзені ўлады РБ пастанавілі, што хлопчык павінен пераехаць у краіну, адкуль паходзіць маці. Пры гэтым яны спаслаліся на польска-беларускае пагадненне ад 1994 года ў справах апекі, якое аддае прыярытэт дзяржаве, адкуль родам бацькі.

Але многія польскія юрысты з гэтым не пагаджаюцца. Напрыклад, прафесар Збігнеў Голда з Цэнтра правоў чалавека ў Познані заяўляе, што ёсць рэчы вышэйшыя за законы і пагадненні. Напрыклад — Еўрапейская канвенцыя правоў чалавека. У кожным выпадку, як лічаць і іншыя юрысты, на першым месцы павінен стаяць клопат пра жыццё і здароўе дзіцяці. Такую ж пазіцыю занялі практычна ўсе СМІ ў Польшчы.

Люблінская пракуратура спрабуе высветліць, хто бацька Яся. (Ёсць звесткі, што сапраўднае імя і прозвішча Яся — Павел Іваноў). Узятыя ўзоры ДНК у дзіцёнка, ягонай біялагічнай маці і меркаванага бацькі, які жыве ў Люблінскім ваяводстве. Калі высветліцца, што бацька паляк, Ясь атрымае польскае грамадзянства.

Тым часам маці Яся звярнулася да люблінскага ваяводы з афіцыйнай просьбай даць ёй від на жыхарства.

У пасольстве Беларусі ў Варшаве цвердзяць, што хлопчыка павінны перавесці ў Гродна, у клініку, якая спецыялізуецца на лячэнні мукавісцыдоза. І што ўлады знойдуць для яго апякунскую сям'ю.

Паводле "Gazety Wyborczej".
Фота Дароты Авёрка-Клімек, *"Dziennik Wschodni".*

У НИХ

Как я гостил у белорусских пенсионеров в Британии

С бывшими жителями Гомеля Иваном Константиновичем и Марией Петровной я познакомился 7 лет назад на курсах английского языка для иностранцев в одном из колледжей Манчестера. Периодически общались, помогая друг другу не утонуть в водовороте чужой жизни. Года два назад они получили вид на жительство и переехали из Манчестера в Лондон. С тех пор контакты прервались. Лишь недавно Константинович позвонил, пригласил в гости: "Я тут дачу под Лондоном приобрел... Приезжай, отметим это дело. Заодно огород поможешь перекопать".

Признаться, я даже растерялся. Какая дача под Лондоном? Откуда деньги? Нет, я, конечно, знал, что фамилия Ивана Константиновича оканчивается на "-ич", но к Абрамовичу отношения не имеет. "Я 34 года работал водителем АТП, из них 28 лет "висел" на Доске почета", — говорил он сам о себе. В общем, Константинович точно не был олигархом и в связях с таковыми замечен не был. Тогда о какой даче может быть спич?

Заинтригованный информацией, я отправился в гости к землякам.

«И как не говорить каждое утро спасибо этому государству!»

Оказалось, что живут они не в Челси (престижный среди постсоветских богачей район Лондона), а на окраине. До ближайшей станции метро — 40 минут автобусом, но район тихий, зеленый, в пяти минутах ходьбы от набережной Темзы.

Домик, который они арендуют, сравнительно небольшой — 2 спальни, обеденная комната с кухней, небольшая гостиная с французским окном. Маленький дворик, где растут цветы и зеленеет трава.

— А это гараж, — открывая дверь в пристройку к дому, поясняет Константинович, — но поскольку машины нет, мы в нем оборудовали мастерскую и летнюю кухню.

— Ну а дача-то где? — интересуюсь. — И сколько заплатили?

— Да нисколько, — отвечает. - Нам, пенсионерам, все дают бесплатно. Дачу завтра покажу. Туда надо ехать автобусом. Район станции "Abbex Wood", по-нашему "Монастырский лес". А сегодня будем кушать драники и немножко пробовать "бимбер". Пенсии у нас хоть и английские, но водку в "Tesco" покупать накладно...

После экскурсии по владениям белорусского маркиза Карабаса жена Константиновича пригласила за стол. Так сказать, откушать чего Бог послал. А Бог в тот субботний день послал бывшим белорусским, а ныне британским пенсионерам драники с жареными грибами, греческий йогурт, по вкусу напоминающий белорусскую сметану, немецкую салями, салат из свеклы, квашеную капусту, гречневую кашу и... бутылочку некой мутноватой субстанции...

— Ну, — разлив "субстанцию" по рюмкам, крякнул Константинович, — за встречу!

Пока закусывали, Мария Петровна быстренько пояснила, откуда снедь:

— Колбаску закупаем в немецком магазине "Лидл", гречку берем в русском магазине... "Слеза комсомолки" называется. А грибочки — в лесу собираем, в том, который "Abbey Wood", возле дачи. Англичане в грибах ничего не понимают. А мы насобираем опят, груздей... Солим сами, жарим.

— Второй тост у меня традиционный, — разливая "бимбер" по второму кругу, пояснил Константинович. — Спасибо королеве Елизавете II, британскому правительству и лично товарищу Толику Блэру за то, что дали нам пенсию, платят за дом... Ведь, честно говоря, ну кто мы для Великобритании? Иностранцы, ни дня не проработавшие в этой стране. За что нам пенсию? Не за что! А они платят...

Как рассказал Константинович, получив вид на жительство, он с женой попытался зарегистрироваться в бюро по трудоустройству, но клерк, узнав, что обоим супругам больше шестидесяти, рассмеялся и сказал, что им надо регистрироваться не здесь, а... в департаменте по пенсиям!

— С тех пор мы получаем 160 фунтов на двоих в неделю, — говорит бывший водитель гомельского АТП, — то есть 640 в месяц...

Из этих денег они платят за газ, воду, электроэнергию, мобильный телефон, TV-лицензию (114 фунтов в год), коммунальные услуги. Чистыми после всех выплат остается 500 фунтов. Минус 30 фунтов в неделю на питание, и того брутто 380 фунтов остается на банковском счету ежемесячно.

Медицинское обслуживание для пенсионеров, не имеющих накоплений, — бесплатное, включая лекарства и услуги дантиста. За курсы английского языка и любые другие курсы обучения, к примеру, пользованию интернетом — тоже платить не надо. Все без исключения люди пенсионного возраста получают специальный бесплатный проездной билет на все виды транспорта. К примеру, пенсионеры, живущие в Лондоне, могут ездить по всему Лондону на всех видах транспорта, кроме такси. Работающему человеку непенсионного возраста это удовольствие обходится в среднем в 120 фунтов ежемесячно. Для проезда в междугороднем транспорте пенсионерам предоставляется 30%-ная скидка.

Если пенсионер хочет поменять в своем доме печь или сантехнику, но у него нет сбережений (а печь, к примеру, стоит 1500 фунтов), то третью часть суммы, а иногда и половину — в зависимости от ситуации, платит государство. Если вы хотите сделать ремонт в доме (квартире), которую арендуете, и вы пенсионер, безработный или инвалид — вам местные муниципальные власти компенсируют стоимость красок и всего остального либо выдадут специальные ваучеры, на которые вы получите краску и стройматериалы в специализированном магазине.

Что касается платы за аренду жилья в случае с нашими земляками, волею судьбы и "перестройки" оказавшихся на чужбине в пенсионном возрасте, — за их дом платит "чужбина". Именно это государство, которое, как они сами говорят, ну совсем ничего им не обязано, платит ежемесячно 700 фунтов.

Честно говоря, когда 7 лет назад я впервые столкнулся с британской системой льгот для малоимущих категорий населения (безработные и временно потерявшие работу, одинокие матери или отцы, инвалиды, пенсионеры, школьники, студенты), понял, что в то время, когда мы только "строили" в своей стране социализм, здесь он давно работал. Без лозунгов, девизов, съездов партии, пятилеток...

Если говорить об арендной плате за дом, то случай с нашими земляками вообще уникальный. Что-что, а придумать какую-нибудь "рационализацию" наши люди всегда умеют. Дело вот в чем: вместе с ними 2 года назад получила вид на жительство их внучка Алеся. Сейчас она учится на медицинском факультете университета в городе Шеффилд. Мало того, что Алеся получила специальный беспроцентный кредит на обучение, который, в сущности, получают все студенты (за год обучения необходимо заплатить 3000 фунтов), она умудрилась взять кредит на покупку дома. Да-да, того самого, в котором живут Алесины дедушка с бабушкой. Вот за них-то государство и платит их внучке 700 фунтов, которые идут на погашение кредита! А, каково? Не знаю, каждый ли британец мог бы додуматься до такой схемы, но наши — додумались.

— Мы выяснили, что по закону внучка является прямой родственницей, — объясняла мне Мария Петровна, — и значит, она имеет право сдать свой дом нам в аренду. Зачем же нам арендовать у чужого? Зачем платить чужому?

То есть получается, за все и за всех в этой схеме платит государство. Помните, как в той сказке про репку: "Дедка за репку, бабка за дедку, внучка за бабку..." В итоге Великобритания оплачивает двум белорусским пенсионерам аренду дома, в котором они живут, и автоматически ввыплачивает кредит, взятый их внучкой Алесей. Если, даст Бог, дед с бабкой проживут еще 20 лет (а среднестатистическая продолжительность жизни в Британии зашкаливает за 80), то Алесе этот дом стоимостью 184.000 фунтов фактически достанется даром.

— Ну и скажи, как после всего этого не говорить каждое утро спасибо этому государству и его чуткому руководству! — разлив по рюмкам "бимбер", спрашивает Иван Константинович. — Я в Беларуси отработал всю жизнь, пенсию дали... Но как уехал за границу — они пенсию платить мне перестали! Это нормально?

Трудно было не согласиться со стариком. В самом деле, если человек заработал пенсию, то государство обязано ее выплатить вне зависимости от того, живет ли человек в стране, к которой, как и воинской части, приписан, или уехал.

— Я ведь уехал почему, — говорит уже захмелевший Константинович, — потому, что государство наше пустило нас по миру... Ну мы и пошли! Но я не жадный! Пусть моя пенсия идет в президентский фонд.

Дачный «кооператив»

...На следующий день, позавтракав, мы засобирались на дачу, которую, как и медицинское обслуживание и прочие "прелести жизни", государство предоставило пенсионерам бесплатно.

— Понимаешь, у них такая политика, — у Константиновича свой взгляд на социальную политику Великой Британии. — Надо всем бедным, даже если они бедны по своей глупости или тупости, дать минимум благ, чтобы они не чувствовали себя обездоленными и не пополняли ряды коммунистической партии. Правда, Британская компартия сдохла в 1991 году, лишившись финансовой поддержки Кремля. Но неважно. Британское правительство все равно считает, что дешевле платить по минимуму миллиону тунеядцев, чем тушить одну революцию...

Под размышления Константиновича мы и подъехали к "Монастырскому лесу", который оказался обычным спальным районом. Однако пройдя сквозь спальный район, попали в лиственный лес. Здесь, прямо на опушке, в обрамлении пятиэтажек, раскинулся "дачный поселок". В принципе, здесь можно было бы построить жилые дома и поиметь кучу денег. Но почему-то муниципалитет отказывается использовать этот "жирный" кусок земли ради прибылей, предпочитая иметь здесь убыточный дачный городок для пенсионеров. Почему? Предлагаю ответить на этот вопрос каждому читателю индивидуально...

В отличие от белорусских дачных кооперативов здесь на каждом лоскутке земли стоит маленькая сараюшка для хранения лопат с граблями. Участок — две сотки земли, на которых большинство пенсионеров разводят цветы. Только наши гомельчане, взяв на двоих вместо двух соток аж шесть, соорудили сарай, в котором вполне можно жить, а вместо экзотических цветов засадили землю картошкой, морковкой, свеклой. Их соседи посмеиваются над "жадными русскими" (здесь в UK всех выходцев из бывшего СССР называют русскими), но преклоняются перед их трудолюбием. (И кто это сказал, что наш народ ленивый?) Соседи наших земляков не все коренные англичане. Есть французы, китайцы, африканцы, немцы...

— Да, хорошая страна Великобритания, — я прощался с земляками на следующее утро. — Но одна проблема — одиночество. Ностальгия — это болезнь, от которой нет лекарства ни платного, ни бесплатного...

— Вот если б их британскую систему да в Беларусь, — мечтательно сказала Мария Петровна. — Это был бы воистину рай на земле...

Евгений СУЛЫГА.

Лондон.

МЕРКАВАННЕ

Рок-імітацыя

Мне ніколі не тэлефанавала столькі людзей, як падчас мінулай "Рок-каранацыі". "Кася, чаму ты не тут? Мы вось сядзім у барчыку, каньячок п'ем..." — "А я сяджу дома і таксама каньячок п'ю!" — "Нам сумна без цябе!" — "Дык чаго вы туды прыпёрліся??!!".

Я не памятаю, колькі год я не была на "Рок-каранацыі". Даўно. Як і на "Басовішчы". У адрозненне ад іншых, хто пасля чарговай імпрэзы кажа "Усё, больш ніколі не прыйду!", а потым мяняе сваё меркаванне, я заўсёды стаўлю тлустую кропку, а каб потым не было спакусы, выступаю ў прэсе з вінавачаннямі. Пасля дарогі назад няма. Так я зрабіла з Басовішчам, калі назвала яго падвойнай правінцыяй — польскай і беларускай. Тое самае і з "Рок-каранацыяй": я не разумею прынцыпа, па якім усё адбываецца. Калі мне ў трэці раз запар вырашылі даць рок-карону, я сказала, што не вазьму, бо гэта ўжо фарс. Арганізатары падумалі і вырашылі: "О, Вераніцы (*Кругловай.* — **Рэд.**) трэба даць!"

Да "Рок-каранацыі" ў мяне дзве асноўныя прэтэнзіі.

Першае — незразумелы фармат. Калі гэта рок, хацелася б, каб гэта быў рок. Паглядзіце на ўдзельнікаў — палова людзей не мае да рок-н-ролу ніякага дачынення. Назавіце проста — "Каранацыя". Класная ідэя — прыз Юрыя Цыбіна (*адзін з арганізатараў "Рок-каранацыі".* — **Рэд.**), напрыклад. (Я б сама заснавала прыз для таго, хто мне падабаецца.)

І другое: а суддзі хто? Арганізатары не могуць быць суддзямі. Гэта называецца карупцыя. І лабіраванне. Цыбін малайчына, што трымае праект. Але я не лічу, што сёлетняя імпрэза будзе значнай падзеяй у музычным жыцці Беларусі.

"Рок-каранацыя" пачыналася ў пэўнай ступені як сяброўская тусоўка. Было вельмі непрыемна, калі потым яна пачала пераўтварацца ў камерцыйны праект. Красамоўны момант. На адной з першых "Рок-каранацый" я праспявала песню "Прэзідэнт, ідзі дамоў!", якая тады яшчэ не была забароненая. Цыбін ужо тады мне сказаў: "Як ты магла такое спяваць?!" — "А што такое?" — "У заале ж быў прэзідэнт "Дайновы". Ён падумае, што гэта пра яго!".

Зараз "Каранацыя" не мае сэнсу, бо камерцыйныя праекты ў гэтай краіне пакуль немагчымыя. Каб рабіць тут бізнес, нельга высоўвацца. А калі не можаш высоўвацца, навошта рабіць рок-н-рольную тусоўку? Бо яна будзе ўжо не рок-н-рольная, а прычасаная ды прыгладжаная. Нельга быць крыху легальным, крыху нелегальным: мы, маўляў, легальныя, толькі не трэба прамаўляць пэўных слоў ды спяваць пэўныя песні. Гэта прывычае да паўпраўды. А паўпраўды не бывае.

Рок для мяне — гэта музыка сацыяльнага пратэсту. Гэта не мэйнстрым. Гэта з серыі "не магу маўчаць". Калі не можаш, атрымліваецца музыка. Калі можаш — пачынаецца "сёння запоўнім гэтую нішу, заўтра — тую". Гэта называецца артысты. А я ніколі не хацела быць артыстам. Артыст пачынаецца тады, калі ты ўступаеш у адносіны не з сабой. Артыст — гэта той, хто грае ролю.

Арганізатары "Каранацыі" ўвесь час намагаюцца патрапіць у афіцыёз. З сабакамі ды парсюкамі на сцэне. Але ім гэта не ўдаецца. Ладзіць афіцыйныя мерапрыемствы пры дыктатуры — гэта, па меншай меры, жаданне ўпрыгожыць сітуацыю. Паказаць, што не ўсё так кепска: вось "Рок-каранацыя" ў нас праводзіцца...

Я ўвогуле вельмі скептычна стаўлюся да памкненняў альтэрнатыўных музыкаў лезці ў дзяржаўныя СМІ, дзе ты існуеш не сам па сабе — ты існуеш "са шпрыцамі, што знайшлі на плошчы", з амапаўцамі, якія бароняць народ ад "неданоскаў і выблюдкаў". Каб гэта рабілася дзеля грошай, я б зразумела. Але ж на гэтай сцэне грошай нікому не даюць. Нават "За Беларусь!". Гэта ў большай ступені ўласныя амбіцыі музыкаў, чым прадуманыя крокі.

Кожны чалавек сам вырашае — удзельнічаць ці не. Хтосьці не можа чыста фізіялагічна — "гігіена не дазваляе". У іншых, можа, гэта такая асветніцкая дзейнасць, і яны згодныя паступіцца сваім іміджам, каб данесці беларускае слова і думку да народа. Такое было падчас дыктатур і ў іншых краінах. Але я не думаю, што такім чынам нешта наладзіцца. Наадварот — камуфлюецца рэальная сітуацыя.

...Відавочна: народу няма куды хадзіць. Відавочна: яны пойдуць на "Рок-каранацыю", але потым будуць пляваць. Адвечная песня.

Тут паўстае галоўная беларуская праблема: у нас так мала ўсяго, што няхай будзе хоць гэта. Хай будзе. Проста гэта ўжо не маё.

Кася КАМОЦКАЯ.
naviny.by

P.S *У гэтым годзе на "Рок-каранацыі" было 10 намінацый. Рок-карону атрымаў лідэр гурта "Нейра-Дзюбель" Аляксандр Кулінковіч. Рок-княжной названа салістка гурта "Тарпач" Вольга Самусік (на здымку). Лепшым кліпам году прызнаны "Капітал" ад "Ляпіса Трубяцкога".*

АСАБІСТАЯ СПРАВА

Кася КАМОЦКАЯ

Лідэр легендарнага гурта "Новае неба". Двойчы рок-княжёўна, ад трэцяй кароны прынцыпова адмовілася. У мінулым журналістка, зараз — прадзюсер дакументальных фільмаў. Па адукацыі сацыёлаг. Песні спявае з дзяцінства. Дакладную колькасць сваіх альбомаў не памятае — вагаецца паміж лічбамі шэсць і сем (насамрэч шэсць).

ФАКТ

Аздараўленне зрабілася раскошай

Адмовіцца ад ведамаснага санаторыя-прафілакторыя вырашыла адміністрацыя прыборабудаўнічага прадпрыемства "Лёс" у горадзе Барані, што непадалёку ад Оршы.
На ўтрыманне гэтай установы не хапае сродкаў, і хутчэй за ўсё санаторый будзе перададзены ў камунальную ўласнасць Оршы.

Санаторый-прафілакторый на 100 месц у Барані быў створаны тады, калі завод, які сёння мае назву "Лёс", зваўся "Чырвоным Кастрычнікам", вырабляў радыёапаратуру і не лічыў грошай, бо меў іх шмат.

У прафілакторыі, дзе бясплатна або па льготных пуцёўках аздараўлялася работнікі прадпрыемства, былі выдатныя ўмовы для ўмацавання здароўя: сучасная дыягнастычная і фізіятэрапеўтычная апаратура, розныя лекавыя ванны і нават басейны.

Цяпер, на новым эканамічным этапе свайго існавання, прадпрыемства не ў стане выдаткоўваць сродкі на здароўе працаўнікоў.

"Лёс" не першае прадпрыемства ў рэгіёне, якое вымушана адмаўляцца ад ведамаснай лячэльні. Тры гады таму ў аналагічным становішчы апынуўся санаторый Аршанскага льнокамбіната на 200 месц.

Як патлумачыла старшыня прафкама Галіна Котава, стратны для прадпрыемства прафілакторый некалькі год не закрывалі таму, што пуцёўкі аплачваў фонд сацыяльнай абароны. Але ў 2006 годзе гэтая сістэма была скасаваная, і камбінат пэўны час аздараўляў сваіх работнікаў за кошт бюджэту прадпрыемства. Так было яшчэ летась, а вось сёлета камбінату такая дабрачыннасць ужо не па кішэні, хоць людзей, якія маюць патрэбу ў аздараўленні, сярод тэкстыльшчыкаў шмат.

— Я разумею, — гаворыць Г.Котава, — што ў сучасных умовах прадпрыемства не ў стане ўтрымліваць прафілакторый, але ён патрэбны! Сёння мы недаацэньваем ягоную карыснасць, але ў будучым зразумеем, як важна падтрымліваць працаздольнасць работнікаў, не дапускаць, каб яны папаўнялі шэрагі інвалідаў.

Такім чынам, лёс прафілакторыя ў Барані, па ўсім відаць, паўторыць лёс аналагічнай установы льнокамбіната: ён будзе перададзены на баланс Оршы. Цяпер галоўная праблема заключаецца ў тым, каб будынак не пуставаў і не разбураўся.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

СІТУАЦЫЯ

Аляксею Угараву не дазваляюць вярнуцца ў родную каманду

Хакеіст нацыянальнай зборнай Беларусі па хакеі Аляксей Угараў, які зараз знаходзіцца ў расійскім Ніжнекамску, дзе гуляе за мясцовы "Нафтахімік", звярнуўся да старшыні Беларускай федэрацыі хакея Уладзіміра Навумава з просьбай дазволіць яму выступаць за мінскае "Юнацтва".

Сваё рашэнне Угараў матываваў тым, што ў "Нафтахіміку" ён не атрымлівае пастаяннай гульнявой практыкі. А таму ў інтарэсах нацыянальнай зборнай, іграком якой ён з'яўляецца, хакеіст прасіў разгледзець магчымасць дазволіць яму выступаць у нацыянальным першынстве. Прычым Угараў называў нават канкрэтны клуб, колеры якога хоча абараняць, — мінскае "Юнацтва". Выбар Угарава на карысць"Юнацтва" зразумець можна — Аляксей выхаванец гэтай хакейнай школы, менавіта "Юнацтва" дала Угараву пуцёўку ў вялікі хакей. Аднак не ўсё так проста...

Іншыя хакейныя клубы не пагадзіліся з такой трактоўкай пытання і ў адзін голас загаварылі пра тое, што ў выпадку, калі Угараў будзе заяўлены за "Юнацтва", гэта не будзе справядліва ў дачыненні да сапернікаў гэтай каманды.

Выканкам федэрацыі хакея Беларусі вынес пытанне аб "справе Угарава" на абмеркаванне. Вынік дэбатаў быў такі: рашэнне аб далейшым лёсе хакеіста павінна прымацца толькі ў інтарэсах нацыянальнай зборнай. А раз так, то і беларускую каманду, за якую павінен выступаць таленавіты нападаючы, павінна вызначыць кіраўніцтва нацыянальнай зборнай. Карацей, слова засталося за трэнерам зборнай Беларусі Куртам Фрэйзерам. Амерыканскі спецыяліст не захацеў быць "ісцінай у апошняй інстанцыі" і заківаў у бок федэрацыі хакея: маўляў, не трэнерская гэта справа — вызначаць, дзе павінны гуляць хакеісты. Фрэйзер адзначыў, што працаўладкаванне Угарава — прэрагатыва федэрацыі. Кола, што называецца, замкнулася...

У сваю чаргу Аляксей Угараў, даведаўшыся, што ягоны лёс будзе вырашаць федэрацыя хакея, зноў пацвердзіў сваю пазіцыю. Хакеіст адзначыў, што ў Беларусі мае намер гуляць альбо за "Юнацтва", альбо нідзе...

Пасля таго як стала зразумела, што сітуацыя вакол Угарава заходзіць у тупік, а таленавіты нападаючы, якому патрэбна гульнявая практыка, з-за чужых амбіцый пакуль яе не атрымлівае, многія загаварылі пра тое, што Курту Фрэйзеру павінен патэлефанаваць галоўны трэнер "Юнацтва" Міхаіл Захараў, з тым каб абмеркаваць сітуацыю.

Міхаіл Захараў катэгарычна заявіў, што Фрэйзеру тэлефанаваць не будзе. Трэнер мінскай каманды прытрымліваецца той пазіцыі, што паколькі Угараў з'яўляецца выхаванцам школы "Юнацтва" і хоча гуляць толькі за гэтую каманду, то так і павінна быць. У якасці аргумента Захараў вылучае наступны тэзіс: астатнім клубам нішто не перашкаджае падрыхтаваць хакеіста ўзроўню Угарава, каб потым прэтэндаваць на тое, каб ён гуляў за тую каманду, якая яго выхавала...

На момант напісання матэрыялу канкрэтнае рашэнне па сітуацыі вакол Аляксея Угарава прынята не было.

Віталь ГАРБУЗАЎ.

ЧУЛІ?

«Прессбол» пазбавілі акрэдытацыі

Рашэннем выканкама Нацыянальнага алімпійскага камітэта ад 28 лютага вядучая спартыўная газета Беларусі "Прессбол" пазбаўлена акрэдытацыі на летніх Алімпійскіх гульнях 2008 года ў Пекіне.

Як паведаміў БелаПАН прэс-аташэ НАК Пётр Рабухін, на пасяджэнні выступіў кіраўнік камісіі НАК па СМІ, старшыня спартакамітэта Узброеных сіл Аляксей Мірашнічэнка, які заявіў, што апошнім часам у "Прессболе" з'яўляюцца публікацыі, якія маюць зневажальны характар у адносінах да кіраўнікоў беларускага спорту і алімпійскага руху.

У інтэрв'ю БелаПАН галоўны рэдактар "Прессбола" Уладзімір Беражкоў назваў пазбаўленне акрэдытацыі "подлай помстай". *"Мы ведалі, што ёсць тыя, хто хоча нас не пусціць у Пекін. Мы ведалі, што нас не любяць. Мы крытыкуем дзейнасць цяперашніх кіраўнікоў беларускага спорту. Але калі дзесьці мы памыліліся — падавайце ў суд"..*

Дзмітрый УЛАСАЎ.

Міністр спорту не задаволены дзюдаістамі

На пасяджэнні выканкама Нацыянальнага алімпійскага камітэта адказ перад міністрам спорту і турызму Аляксандрам Грыгаравым трымаў старшыня Беларускай федэрацыі дзюдо Аляксандр Шчурко. Ён растлумачыў няўдачы Ігара Макарава, які быў алімпійскім чэмпіёнам чатыры гады таму, абвастрэннем у яго старой траўмы, а таксама праблемамі з лішняй вагой. На паездку ў Пекін Макараў мае вельмі мізэрныя шанцы.

Як прызнаўся міністр спорту Аляксандр Грыгараў, у яго даўно была занепакоенасць станам спраў у нацыянальнай камандзе па дзюдо: "Аднак тады мяне не падтрымалі, перасцерагаючы ад залішне жорсткіх крокаў. Што ж, я не маю права не давяраць алімпійскаму чэмпіёну. Аднак наступныя падзеі пацвердзілі, што боязь была небеспадстаўнай. І нядаўна ў мяне прайшла сустрэча з Ігарам Макаравым, які мне прама сказаў, што болей не ў стане выступаць у вагавай катэгорыі да 100 кілаграмаў. І гэта за паўгода да пачатку Алімпіяды!"

Антон ВІТАЛЬЕЎ.

СКАНДАЛ

Буря над «Сожем»

Баскетбольный клуб "Сож" начало лихорадить так, что в дело вмешались контрольные органы.

Чаша терпения у главного тренера и игроков команды была переполнена, когда руководство клуба в очередной раз не выплатило им зарплату, которую последний раз спортсмены держали в руках осенью прошлого года. И команда дружно отказалась ехать на очередной матч первенства страны.

"Мы дошли до отчаяния, поэтому и вынуждены были пойти на такой шаг, — выступил в прессе тренер "Сожа" Леонид Гребеньков. — Баскетбольный клуб "Сож" значится только на бумаге — до сих пор не зарегистрированы его уставные документы. Непонятно, каким образом он вообще попал в президентский указ о спонсорской помощи. Вероятно, кто-то выдал желаемое за действительное. Из-за этого все беды: спонсоры и хотели бы выделить нам деньги, да не могут. На счету же — ноль. Куда подевались деньги — тайна за семью печатями. Сколько раз обивал пороги спортуправления, но там никто не собирается вмешиваться в наши дела. Мол, у вас общественная организация, так что уж как-нибудь сами разгребайте свои завалы. Да еще обиделись, когда узнали, что мы решили написать в Администрацию президента. А ведь положение действительно бедственное!"

Не остался в стороне и недавно назначенный руководитель ГОСО "Гомельский баскетбол" Анатолий Рогозенко.

По его словам, *"до моего прихода было допущено много ошибок, но после серьезнейшей проверки, организованной по инициативе команды, все недостатки были выявлены, а председатель Николай Кулага был освобожден от должности"*.

Оказывается финансовые счета были заблокированы из-за проверок контрольными органами, а поэтому деньги так и не поступали. При этом Анатолий Рогозенко не преминул "пройтись катком" и по главному тренеру: *"Я обращался к команде, просил ее доиграть чемпионат, обещал, что зарплаты будут выплачены в полном объеме по контрактам, но они требуют финансы прямо сейчас. Думаю, в такой позиции игроков виноват тренер, который начал поднимать шумиху..."*

— Меня и ребят уволили, посчитав, видимо, что мы не имеем права высказать собственное мнение, — рассказывает Анатолий Гребеньков. — Как будто мы просили что-то сверхъестественное, а не свое, положенное по контрактам. Сегодня нам говорят, что о демарше мы должны были предупредить за две недели. Это просто смешно, потому что о наших проблемах мы говорим не две недели и даже не месяц. Но нас все время просили подождать. Так сколько можно лгать? У спортсменов что, нет своих семей? Им не надо приносить в дом деньги? Ребята и так долгое время играли на энтузиазме и моих уговорах. Но все время ведь закрывать на проблему глаза нельзя.

По словам заместителя ГОСО "Гомельский баскетбол" Николая Кулаги, сейчас ситуация в команде нормализуется, хотя "тренер и еще пять игроков за саботаж уволены".

— Тренировать команду стал перспективный детский тренер Андрей Чваньков, а тем, кто приступил к тренировкам, уже частично выплачена задолженность по зарплате, — говорит Николай Николавич. — В марте будут рассчитаны все — в том числе и тренеры. Что касается всей этой ситуации... Это стечение обстоятельств. У нас действительно была небольшая финансовая пропасть.

Таким образом, если верить руководству клуба, дела у команды идут на поправку, но вопросы тем не менее остаются. В первую очередь — почему пострадали те, кто требовал свое законное? Если клуб еще юридически не зарегистрирован, то как он получал спонсорские деньги по президентскому указу о поддержке баскетбольных клубов? И наконец — кто за все это ответит? Может быть, эти вопросы и заинтересуют наше славное Министерство спорта, которое в данной ситуации — как воды в рот набрало.

Алесь СИВЫЙ.

ОБРАТНАЯ СВЯЗЬ

Лодка исчезла и... вновь появилась

"Прочитал в вашей газете интервью с олимпийской чемпионкой по академической гребле Екатериной Карстен, которая рассказала, что ей не заказали к Олимпиаде лодку. Решается этот вопрос как-нибудь или нет? И кто виноват, что не заказали?"

Виктор ПОТРЕБИН, г.Минск.

В конце прошлой недели министр спорта и туризма Александр Григоров заявил на коллегии, что лодка для спортсменки будет готова уже к марту.

"Произошло недоразумение, — поведал нам гостренер по академической гребле Анатолий Лебедь. — Я не знаю, почему Катя сделала такое заявление, потому что все заказано, и лодка у нее будет уже в конце марта. Известно только, что первым поднял шум тренер гребчихи Норберт Ладерманн. Для Кати лодка делается по индивидуальному заказу, так что поводов для волнений нет".

Алесь СИВЫЙ.

ШАХМАТЫ

Из творчества читателей Ч.Якубовский

Белые: Крb6, Фf1, Ле2, Кd4, пп. b3, e7 (6).
Черные: Крb4, п. С4 (2).
Мат в 2 хода.

Публикуем двухходовую задачу минчанина Чеслава Якубовского. Попробуйте найти ее решение. Свои ответы присылайте по адресу: **220030, Минск, ул.Энгельса, 34а, редакция газеты "Народная воля", "Шахматы"**.

Победа Алексея Федорова

Первый чемпионат Беларуси по шахматам прошел в далеком 1924 году. Тогда победителем стал минский врач, впоследствии доктор медицинских наук и шахматный мастер Соломон Розенталь. До войны состоялось 12 чемпионатов. В них выросли первые белорусские мастера витеблянин Владислав Силич, минчанин Гавриил Вересов и гомельчанин Абрам Маневич. С 1947 года чемпионаты республики проводятся ежегодно. Чемпионат 2008 года, который прошел в Минске, был 74-м по счету. Больше всех быть чемпионом удавалось минчанину, международному гроссмейстеру Вячеславу Дыдышко — 11 раз! По 7 раз выигрывали золото мастера Владимир Сайгин и Альберт Капенгут, по 6 раз — Гавриил Вересов и Алексей Суэтин.

Чемпионат Беларуси 2008 года (высшая лига) собрал сильный состав. За чемпионский титул и призовые места боролись международные гроссмейстеры Алексей Федоров (Могилев), Виталий Тетерев (Новополоцк), минчане Сергей Азаров, братья Сергей и Андрей Жигалко, Игорь Люцко, Юрий Тихонов, международные мастера и мастера спорта Павел Ломако, Сергей Михайловский, Владимир Романенко, Евгений Подольченко, Валерий Смирнов, Кирилл Ступак, чемпион страны среди юношей в возрасте до 20 лет кандидат в мастера Юрий Борсук.

Со старта на турнире развернулась острейшая борьба за лидерство. Вперед вырвался 18-летний гроссмейстер Сергей Жигалко, набравший в первых четырех турах 3,5 очка. Однако стоило лидеру чуть притормозить, как его догнали. После первой половины турнира — 7 туров таблицу чемпионата возглавляли трое — Сергей Жигалко, Алексей Федоров и Юрий Тихонов, имевшие по 5 очков. В следующих турах наиболее результативно играл Юрий Тихонов, набравший 2,5 очка. После 10 туров у Тихонова было 7,5 очка, у Алексея Федорова — 7 очков, у Сергея Жигалко — 6,5. Исход соперничества решился лишь в последнем туре, к которому Тихонов и Федоров подошли с одинаковым количеством очков — по 8,5. На пол-очка меньше было у С.Жигалко. В заключительной партии Федоров сумел победить успешно игравшего в турнире самого молодого участника 17-летнего Кирилла Ступака. Вот как это произошло.

А.Федоров — К.Ступак Французская защита

1.e4 e6 2.d4 d5 3.Кc3 Кc6 4.e5 f6 5.Сb5 Сd7 6.Кf3 a6 7.С:c6 С:c6 8.o-o f5 9.Кg5 Фd7 10.b3 Кh6 11.a4 Кf7 12.Кh3 a5 13.Кf4 g6 14.Кce2 Сh6 15.Сa3 Лd8 16.Фd3 b6 17.Лfd1 Сb7 18.h4 Сf8 19.С:f8 Кр:f8 20.Лac1 c6 21.c4 Сa6 22.Фc3 Кре7 23.Фb2 Кh6 24.Лc3 Лb8 25.Фc1 Лbc8? 26.К:e6! **Черные сдались.**

Теперь все зависело от партии Сергея Жигалко с Юрием Тихоновым. В упорной борьбе Сергею удалось переиграть своего более опытного соперника.

С.Жигалко — Ю.Тихонов Сицилианская защита

1.e4 c5 2.Кf3 d6 3.d4 cd 4.К:d4 Кf6 5.Кc3 a6 6.Сe3 e5 7.Кb3 Сe6 8.Фd2 Кbd7 9.o-o-o Сe7 10.f4 Лc8 11.f5 Сc4 12.h3 b5 13.g4 b4 14.Кd5 К:e4 15.Фg2 С:d5 16.Л:d5 Кef6 17.Лd1 h6 18.С:a6 Лb8 19.h4 h5 20.g5 Кg4 21.Сg1 Лa8 22.Сb7 Л:a2 23.Крb1 Лa5 24.Фc6 e4 25.К:a5 Ф:a5 26.Лd5 Фd8 27.Сc8. Угрожает 28.Сb6! 27...e3 28.Сh2 e2 29.Сf4 o-o 30.С:d7 Фb8 31.Фa6 Фc7 32.Сa4. **Черные сдались.**

В итоге в третий раз титул чемпиона страны завоевал Алексей Федоров — 9,5 очка из 13. Победитель оказался единственным из участников, которому удалось провести трудный турнир без единого поражения. Всего пол-очка уступил чемпиону Сергей Жигалко — 9 очков. Бронзовая награда досталась Юрию Тихонову — 8,5. Следует отметить успех дебютанта чемпионатов Кирилла Ступака. Набрав 7,5 очка, он финишировал четвертым. Весомая заявка на будущие успехи. На последующих местах: 5.Сергей Азаров — 7,5, 6.Евгений Подольченко — 7, 7.Виталий Тетерев — 7, 8.Павел Ломако — 6,5, 9.Владимир Романенко — 6,5, 10.Сергей Михайловский — 6,5, 11.Андрей Жигалко — 6, 12.Игорь Люцко — 4, 13.Юрий Борсук — 3, 14.Валерий Смирнов — 2,5.

Итоги чемпионата будут учитываться при комплектовании сборной команды Беларуси, которой в этом году предстоит выступить на Всемирной шахматной Олимпиаде.

Чемпион замкнул таблицу

В городе Витория (Испания) прошел гроссмейстерский международный турнир с сильным составом участников. В нем выступили экс-чемпионы мира и ФИДЕ Анатолий Карпов (Россия), Веселин Топалов (Болгария), Руслан Пономарев (Украина), Рустам Касымжанов (Узбекистан), экс-чемпион Европы Ливиу-Дитер Кисипяну (Румыния), сильнейшая в мире шахматистка Юдит Полгар (Венгрия). Соперники проводили между собой по 2 партии. Победителем стал В.Топалов, набравший 7 очков из 10. На полтора очка отстал Р.Пономарев. По 5 очков в активе Л-Д.Кисипяну и Ю.Полгар, разделивших 3-4-е места. За ними Р.Касымжанов — 4,5. Впервые в жизни занял последнее место в турнире А.Карпов — 3 очка. Прославленный чемпион не одержал ни одной победы!

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

Можаце дапамагчы— калі ласка, дапамажыце!

Сапраўды, найскладанейшыя часы перажывае "Народная воля". І Ваша, шаноўныя чытачы, падтрымка — зарука таго, што мы вытрымаем. Можаце дапамагчы — калі ласка, дапамажыце.

У чарговы раз нагадваем: калі Вы не зрабілі **перадаплату** за сакавік, Вам трэба тэрмінова завітаць у любы філіял "Беларусбанка" альбо ў любое паштовае аддзяленне і запоўніць бланк, узор якога мы друкуем кожны тыдзень. Мінчане могуць аператыўна зрабіць **перадаплату** таксама праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: 328-63-93 ці 328-68-71. Пасля званка да Вас прыйдуць нашы валанцёры са свежымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць перадаплату за любы тэрмін.

Дарэчы, многія з Вас, шаноўныя чытачы, зрабілі **перадаплату** толькі за першы квартал. Паспяшайцеся, калі ласка, зрабіць гэта і за другі квартал. **Ужо можна пералічваць грошы і за другое паўгоддзе**.

Нягледзячы на экстрэмальныя ўмовы выдання газеты, тарыфы па перадаплаце ранейшыя: на месяц — **9500** рублёў для індывідуальных чытачоў і **15.000** рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм. Заўважым: паколькі кошт газеты пры рэалізацыі ў розніцу з новага года павысіўся, то выгадна рабіць **перадаплату** з тым, каб газета дастаўлялася дахаты.

Банкаўскія рэквізіты "Народнай волі" такія:

УП "Народная воля": р/р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.

Вымушаны і на гэты раз звярнуць увагу на тое, што перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ, узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары.

Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі. Разумеем: для тых, хто рабіць гэта будзе ўпершыню, не вельмі прыемная рэч. Але што зробіш: каб своечасова атрымліваць газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

Вы — з "Народнай воляй", "Народная воля" — з Вамі!

0402280179
ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за январь, февраль, март, апрель, май, июнь 2008 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за январь, февраль, март, апрель, май, июнь 2008 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

КВИТАНЦИЯ
Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операций по уплате налогов.

Абонентская карточка

на номера газеты «Народная воля»
за январь, февраль, март, апрель, май, июнь 2008 г.
(ненужное зачеркнуть)

*Заполняется обязательно **печатными буквами** и обязательно отправляется в редакцию с **копией платежного документа***

фамилия
имя отч.
индекс почтового отделения
область
район
название населенного пункта
город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)
улица
пр-т
переулок *(нужное— подчеркнуть)*
дом *д.,б.,в.,2* корп. кв.

(Примечание: в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)

УСЛУГИ

Прием стеклотары, вторсырья и другая помощь инвалидам, пенсионерам г.Минска.

Тел. 8-033-661-11-87.

Утерянное удостоверение

Инвалида II группы №012103, выданное 26.05.98 года на имя Михнюка Александра Михайловича, считать недействительным.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 3286871.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 3286904, 3286906
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 04.03.2008 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 10 026 экз. Заказ №